Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט אייך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВКіСНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ 7 лютага 1932 г. № 30 (3419)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Наперад, да другой пяцігодкі пабудовы сацыялізму. Вач. Палесні «Выйдуць крышыць сьнег».

XVII партканфэрэнцыя УсеКП(б) аб другой пяцігодцы, даклад тав. МОЛАТАВА.

Прывітаньне прадстаўніка ЦК КПЗБ (4 стар.). Вывезьці загатоўлены лес (4-ая старонка).

Паказваем перавагі, гаспадарча-разьлікових брыгад (3-ая стар.). Арганізацыяй ударнага канвэеру паміж апрацоўкай і загатоўкай дабіцца перамогі ў лёназагатоўках (3-ая стар.).

Падрыхтоўка замаху на тав. ЛІТВІНАВА.

У Шанхаі арганізаваны рэвалюцыйны камітэт рабочых і салдатаў

Інфармацыйнае паведамленьне

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя закрылася ўчора ўвечары 4 лютага. Па сканчэньні канфэрэнцыі адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б). Пленум зацьвердзіў рэзалюцыю XVII усесаюзнай канфэрэнцыі па дакладах т.т. АРДЖАНІКІДЗЕ, МОЛАТАВА і КУЙБЫШАВА. З прычыны адсутньня тав. РУДЗУТАКА старшынём ЦКК УсеКП(б) пленум вызваліў яго ад абавязкаў члена Палітбюро ЦК. Пленум папоўніў Палітбюро ЦК, увёўшы ў яго склад тав. АНДРЭЕВА А. А.

17 УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

Даклад В. М. МОЛАТАВА

Таварышы! Самы факт, што наша партыя прыступае да абгаварэньня задач другога пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі, гаворыць за сябе. Ён гаворыць, перш за ўсё, аб тым, што наш першы пяцігадовы плян выконваецца з посьпехам. Ён гаворыць далей аб тым, што ў нас ёсьць поўная ўпэўненасьць, што 1932 год будзе годам завершэньня пяцігодкі, што мы першую пяцігодку скончым за чатыры гады. На значэньні гэтага факту, факту прапрацоўкі СССР другога пяцігадовага пляну трэба спыніцца.

Па-першае, аб міжнародным значэньні гэтага факту. Міжнароднае значэньне гэтага факту заключаецца ў тым, што рабочы любой краіны, што працоўны любой дзяржавы мае магчымасьць параўнаць рэзультаты панаваньня буржуазіі ў капіталістычных дзяржавах з рэзультатамі, з першымі ашчэ рэзультатамі панаваньня рабочай клясы ў краіне пралетарскай дыктатуры. Пры гэтым мы не адмаўляем ся ад параўнаньня з самымі перадавымі ў тэхніка - эканамічных адносінах, з самымі багатымі і з самымі магутнымі ў капіталістычным сьвеце краінамі. У даны момант, калі крызіс ахапіў усе капіталістычныя краіны і паглыбляецца ўсё далей, арыйнёваючы прамысловасьць і шыпыя галіны гаспадаркі, параўнаньне буржуазных дзяржаў з Савецкім Саюзам асабліва паразьлівае. Гэтае параўнаньне дае магчымасьць бяз хістаньня адказаць на пытаньне аб тым, за кім будучыня—за пралетарыятам і яго ўладай, ці за буржуазіяй і яе панаваньнем? Ясна, што з міжнароднага пункту гледжаньня наш посьпех, пераможны посьпех будаўніцтва сацыялізму, увасаблёны ў пасьпяховым ажыцьцяўленьні першай пяцігодкі і цяпер у першых наметках другой пяцігодкі, для рабочых і працоўных усіх краін гаворыць аб тым, што будучыня не за панаваньнем буржуазіі, а за дыктатурай пралетарыяту, што факты гавораць супроць капіталізму, у карысьць сацыялізму.

Па-другое, з пункту гледжаньня ўнутры - савецкага, факт нашага пераходу да задач другой пяцігодкі так сама гаворыць шмат аб чым. Гэта адна з рашаючых праверак таго, што дае кіраўніцтва рабочай клясы ў адносінах сялянскай масы пасьля зьвяржэньня ўлады буржуазіі. У СССР упэўнены ў сусьветнай гісторыі ўпа да знаходзіцца ў руках рабочай клясы, якая вядзе за сабою працоўныя масы вёскі, ажыцьцяўляе разам з імі перабудову ўсёй народнай гаспадаркі на сацыялістычнай аснове. Наш посьпех, пераможны посьпех рабочай клясы, заключаецца ў тым, што разгортваецца будаўніцтва сацыялізму ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы, што і самая адсталая частка працоўных, працоўныя вёскі пачынаюць узьнімацца да сацыялізму, да бясклясавай сацыялістычнай грамады.

Нарэшце, непасрэдна з гаспадарчага пункту гледжаньня нашы посьпехі ёсьць посьпехі плянавага сацыялістычнага будаўніцтва. Да гэтага часу ні ў адной краіне, нідзе ў сьвеце ня было плянавай дзяржаўнай гаспадаркі. Мы робім тут першыя крокі, і рэзультаты ўжо ў наяўнасьці. Ад вырашэньня адных заданьняў мы пераходзім на новых і з кожным годам усё больш буйных.

Посьпех плянавай сацыялістычнай гаспадаркі, гэта—ня толькі і нават ня столькі посьпех непасрэдна нашых гаспадарча - плянавых органаў. Наша плянаваньне і ўлік не абмяжоўваюцца гэтымі параўнальна вузкімі рамкамі. Сапраўдная гаспадарчая работа, арганізацыя народна - гаспадарчага ўліку і выпрацоўка пляну можа весьціся і на справе вядзецца з актыўным удзелам рабочых мас, часамі ў ходзе прапрацоўкі на мясцох, якія значна мяняюць першапачатковыя намячэньні.

Абапіраючыся на гэту актыўнасьць рабочай клясы і працоўных у сацыялістычным будаўніцтве, выпрацоўваюцца пад кіраўніцтвам партыі нашы гаспадарчыя пляны.

Нельга таксама забываць той вялізарнай работы па выпрацоўцы пляну народнай гаспадаркі, якая адбывалася перад падрыхтоўкай другога пяцігадовага пляну.

Першым плянам народнай гаспадаркі быў плян электрыфікацыі, плян ГОЭЛРО. Гэта быў чарнавы накідак, пачатак, завязка справы ўсеагульнай тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі нашай краіны. Гэтая работа мела вялізарнейшае значэньне для ўсёй нашай гаспадарчай работы і для разьвіцця самой справы плянаваньня.

Мы ведаем далей, што ў свой час была прароблена вялікая работа па складаньні першых гадавых пляноў—«кантрольных лічбаў народнай гаспадаркі». Упяршыню кантрольныя лічбы былі зацьверджаны ў 1925-26 г., з тэй пары яны зацьверджаюцца кожны год і набываюць усё большае значэньне для справы гаспадарчага кіраўніцтва.

Амаль адначасова з выпрацоўкай першых гадавых народна - гаспадарчых пляноў пачалі падрыхтоўвацца больш шырокія пляны перабудовы на роднай гаспадаркі. На працягу раду год вялася работа па падрыхтоўцы першай пяцігодкі і адначасова падрыхтоўваўся так званы «генэральны плян» перабудовы народнай гаспадаркі з разьлікам на 10—15 год. Гэтая апошняя работа ня была скончана. Але паколькі была выпрацавана і ажыцьцяўляецца першая пяцігодка і цяпер выпрацоўваецца другая пяцігодка, пастолькі асноўныя пытаньні так званага «генэральнага пляну» вычэрпаюцца гэтымі дзьвюма пяцігодкамі, з часткова ўжо ставяцца ў больш разгорнутым выглядзе. І так, перад намі чэрнем другой пяцігодкі адбывалася вялікая работа, і без яе былі-б немагчымым падрыхтоўка і абгаварэньне пытаньняў другога пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі.

I. Да вынікаў першай пяцігодкі

Вы ведаеце, таварышы, што партыі былі паданы два варыянты пяцігодкі, а іменна: «адпраўны» і «аптымальны». Аптымальны варыянт быў разьлічаны на найбольш спрыяючыя па думцы Дзяржпляну, умовы для Савецкага Саюзу. Партыя прыняла за аснову аптымальны варыянт, г. зн. плян з вышэйшымі гаспадарчымі заданьнямі. Іменна гэты аптымальны, разьлічаны на спрыяючыя ўмовы пяцігадовы плян мы за раз і выконваем. Партыя дабілася таго, што высунуты самымі масамі лёзунг: «пяцігодка — за чатыры гады» ажыцьцяўляецца пераможна. Мы ажыцьцяўляем указаны аптымальны варыянт пяцігодкі не за пяць год, як у пачатку намячалі, а за чатыры гады, г. зн. скарачаючы на ¼ тэрмін выкананьня пяцігадовага пляну ў яго аптымальным (вышэйшым) варыянце.

Посьпехі першай пяцігодкі — посьпехі палітыкі індустрыялізацыі і, значыць, палітыкі ўсёдыму цяжкай індустрыі, вырад сродкаў вытворчасьці ў першую чаргу. Гэтыя посьпехі характарызуюцца тым, што мы маем да сучаснага моманту ўласную базу для завяршэньня тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Для справы далейшага росту сацыялізму ў СССР гэты факт мае рашаючае значэньне.

Посьпехі першай пяцігодкі знаходзяць сабе выяўленьне такома ў выключных посьпехах калектывізацыі, у разгорнутым будаўніцтве саўгасаў і калгасаў. У адсталай, ашчэ ўчора раз дробленай вёсцы будуецца цяпер буйная, сацыялістычная гаспадарка, на аснове машыннай, тэхнікі. Мы ўжо дасягнулі такога становішча, што і ў сельскай гаспадарцы пануючае становішча займаюць сацыялістычныя формы. Гэтым выражана самая цяжкая і самая важная задача пралетарскай рэвалюцыі.

Як-бы ня былі вялікі, проста грандыёзны задачы другой пяцігодкі, нельга забываць аб тым, што пасьля Кастрычніцкага перавароту самая цяжкая задача заключаецца ў перабудове сельскай гаспадаркі на базе калектывізму і высокай машыннай тэхнікі. Іменна гэтую задачу партыя пераможна ажыцьцяўляе і ажыцьцяўляе і ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што ў 1932-33 годзе калектывізацыя ў СССР у асноўным будзе скончана.

Усё гэта дае магчымасьць партыі сказаць, што карэннае ленінскае пытаньне — «хто каго» — вырашана супроць капіталізму, вырашана ў карысьць сацыялізму. Гэта—важнейшы вынік для ўсяго ня толькі гаспадарчага, але і палітычнага развіцьця СССР за мінулы пэрыяд.

Нельга ня бачыць, што за гэтыя гады ня ўсё выконвалася паводле намечанага пляну. Ня толькі ў асобных гадох, але і ў цэлым партыя ўнесла зьмены ў першую пяцігодку.

Падам некалькі прыкладаў.

У пяцігодцы, напрыклад, не намячалася, што нават да канца пяцігодкі беспрацоўе ў нашай краіне будзе поўнасьцю ліквідавана. Так, пяцігадовы плян намячаў вялізарнае скарачэньне беспрацоўя, але ў той момант, у момант яго прыняцьця, прадбачыць, што беспрацоўе ў СССР будзе ліквідавана ўжо ў 1930-31 годзе, аказалася немагчымым. Як бачыце, мы крыху парушылі плянавае намячэньне, але можна спадзявацца, што такая зьмена, або вярней, такое паляпшэньне пляну цалкам у інтарэсах рабочай клясы і сустракаецца ёю з поўным спачуваньнем.

У адносінах гаспадарчых задач першай пяцігодкі партыя ўнесла такую вялікую зьмену, як стварэньне новай мэталюргічнай базы на Усходзе, у Урала-Кузьнецкім раёне.

Н. ў адным з чатырох томаў пяцігадовага пляну аб мэталюргічнай базе на Усходзе нічога не гаворыцца, але ці можна цяпер абмяркоўваць пер шую пяцігодку без таго, каб не гаварыць аб стваранай намі новай мэталюргічнай базе ў Урала-Кузьнецкім раёне.

Зразумела, нельга. Тым больш цяпер, калі пушчана першая домна ў Магнітагорску і на чарзе пуск новай домны ў Магнітагорску і Кузьнецку. Такім чынам і тут унесена папраўка ў пяцігодку, папраўка ня дрэнная, папраўка добрая, супроць якой ні адзін рабочы СССР ня толькі не пярэчыць, а наадварот, гатовы ўсяляк падтрымліваць яе.

Пяцігодка прадугледжвала адны тэмпы калектывізацыі, выйшлі другія. Мы ўжо даўно пераступілі праз тэмпы калектывізацыі і разгортваньне саўгасаў, якія намячаліся ў пяцігодцы. Гэта таксама вельмі істотная папраўка да пяцігадовага пляну, але папраўка ня дрэнная, такая папраўка, якая сур'ёзна паляпшае справу. У мільённых масах сялянства, не гаворачы ўжо аб рабочай клясе, няма пярэчаньняў супроць гэтай «папраўкі», як цалкам адпавядаючай палітыцы партыі, ленінізму.

На жаль, нельга сказаць, што нашы папраўкі да пяцігадовага пляну былі зроблены толькі ў добры бок. Сёе-тое атрымалася ў нас і наадварот.

Нельга, напрыклад, забываць аб наступных трох момэнтах.

Мы ня выканалі заданьня па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы ў прамысловасьці. Гэта—наш вялізарны мінус. Ясна, што мы павінны ўсё зрабіць для таго, каб паправіць гэтую справу, абапіраючыся на ўмацаваньне пралетарскай дысцыпліны, рост тэхнікі і ўладаньне ёю нашымі кадрамі.

Мы ня выканалі таксама намячэньня пяцігодкі ў адносінах росту ўраджайнасьці. Мы знаходзімся тут усё яшчэ на вельмі нізкім узроўні, значна больш нізкім, чым у намячэньнях пяцігодкі. Ясна, што трэба і па гэтай частцы падкінуць фронт, выправіць справу.

Мы ня выканалі і адчуваем кожны дзень, што ня выканалі задач па рэканструкцыі транспарту, чыгуначнага асабліва. Бідаўчына, што і, па гэтай частцы шмат партыя трэба працаваць, каб хутчэй паленьшыць справу, каб узьнять на належную вышыню наш транспарт.

Вынікі першай пяцігодкі з палітычнага пункту гледжаньня будуць асьветлены невыстрачальна, калі не закрануць пытаньня аб тым, у якіх умовах разгортвалася барацьба партыі за выкананьне пяцігодкі, з якой крыты-

кай і контр-прапановамі выступалі апазыцыйныя групы як з боку трацкістаў, так і з боку права-ухілістаў.

Урокі мінулага маюць першазраднае значэньне для партыі і ўсёй рабочай клясы. Таму неабходна напомніць, прынамсі, важнейшыя моманты барацьбы з так званымі «левымі» і правымі ўхілістамі. Тым больш, што барацьба з падобнага роду ўхіламі і асабліва з правай небясьпекай, як галоўнай, нямінуча і ў далейшым.

Напамінаю, што дырэктывы па першай пяцігодцы былі ўхвалены Цэнтральным камітэтам перад XV зьездам партыі і абмяркоўваліся на гэтым зьезьдзе. Супроць тэзісаў ЦК аб першай пяцігодцы трацкісцкая апазыцыя выступіла са сваімі контр-тэзісамі. Гэта быў вельмі пухлы дакумант, наскрозь варожы лініі партыі, заключаўшы ў сабе, здаецца, усе, якія толькі можна уявіць, паклёпніцкія выдумкі супроць ЦК.

Напомню, далей, што правыя ўжо ў момант прыняцьця XVI партыйнай канфэрэнцыяй тэзісаў аб пяцігадовым пляне, папрабавалі выступіць са сваім контр - планам. Варта хаця-б зазначыць на так важную «двухгодку», якая ў замаскаваным выглядзе прыступалася пастанове ЦК аб пяцігадовым пляне і па супрасьці прыступалася палітычнай лініі партыі.

Аб усім гэтым даволі гаварылася ў свой час. Цяпер важна паглядзець на падзеі мінулага з пункту погляду вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва апошніх 3—4 год. У сувязі з гэтым мне прыдзецца прывесьці некалькі вытрымак з дакумантаў і выступленьняў апазыцыянэраў трацкісцкага, права-апартуністычнага толку.

Возьмем пытаньне аб капітальным будаўніцтве прамысловасьці, якое мае, як усім вядома, буйнейшае палітычнае значэньне ў ажыцьцяўленьні палітыкі індустрыялізацыі. Вось што пісалі трацкісты ў сваіх контр - тэзісах наконт тэзісаў нашага ЦК аб пяцігадовым пляне:

«Ці даюць яны (тэзісы) самастойны плян вырашэньня карэннага пытаньня аб капітальных затратах прамысловасьці? Не. І гэтым яны дапамагаюць таму, што на практыцы ўсё больш урачыстваюць анты - пралетарскія тэндэнцыі ў асноўным пытаньні аб сувносінах сацыялістычных і капіталістычных элемэнтаў у нашай гаспадарцы».

Паводле трацкісцкай пляцформы выходзіла, што тэзісы партыі аб пяцігодцы вялі да «ўрачыстасьці» антыпралетарскіх тэндэнцый». Ну, ці ня сьмешна гэта чытаць пасьля чатырох год?.

Што гаварылі аб тэмпах капітальнага будаўніцтва прамысловасьці з другога флянгу, з правага флянгу? З правага боку, праўда, у даволі заблытанай форме, але з ясна выказанай палітычнай тэндэнцыяй, гаварылі, прыкладна, так:

«Нельга разумець справу так, што ўкладаньні ў прамысловасьць увесь час будуць узрастаць у геомэтрычай прагрэсіі аж да разгорнутага камуністычнага ладу. Мысьліма і паніжэньне крывой укладаньняў».

Адным словам, правыя зварочвалі на «крывой» у бок. (сьмех).

Возьмем шпер тое, што адносіцца да вёскі. Што гаварылі контр-тэзісы трацкісцкай апазыцыі аб палітыцы партыі ў вёсцы? А вось што:

«Тэзісы ЦК зусім няправільна бяруць за адну дужку капіталізм у горадзе і капіталізм у вёсцы, сьцьвярджаючы, што і аграрны капіталізм разьвіваецца толькі абсалютна. На самой справе, капіталізм у вёсцы расьце і абсалютна і адносна, расьце з вялікай хуткасьцю, і з кожным днём павялічваецца залежнасьць савецкай дзяржавы і яе прамысловасьці ад сыр новых і экспартных рэсурсаў заможна-кулацкай часткі вёскі».

І далей:

«Адзе хуткі рост капіталістычных элемэнтаў у земляробстве на базе дробнай таварнай вытворчасьці. Расьце, дакукючы гэтаму, залежнасьць дзяржаўнай гаспадаркі ад кулацка-капіталістычных элемэнтаў у галіне сырцу, экспарту, харчовых запасаў» (падкрэслена ў арыгінале).

Няма патрэбы займацца зараз падрабязным разглядам гэтых трацкісцкіх заяў. Спытаць-бы наша зараз, пасьля трох год пяцігодкі, ці вельмі мы ад яго залежым, ці—больш ясна залежыць ад савецкай улады! (Сьмех).

З другога, з правага флянгу з дню ў дзень пітлі, што «асноўнай крывой хлеба будуць яшчэ добрі час індывідуальныя гаспадаркі сялян», а таму цішай з наступленьнем на кулака. Як вядома, адпасобнікі не згадзіліся з прапаноўлістамі і масамі пайшлі ў калгасы ўжо ў 1929 г. Усе мы добра ведаем, як гэта адбылося, і таму я абмежуюся сказаным.

Але галоўнае, урэшце, заключаецца ў тым, што «левыя» і правыя апазыцыянэры гаварылі аб перспектывах пралетарскай рэвалюцыі ў цэлым. Напомнім і аб гэтым.

У контр-тэзісах трацкістаў разьвівалася трусьлівая мысьліцка аб узьнікненьні «зародку двааўладзтва», якое пагражае дыктатуры пралетарыяту» (падкрэслена ў арыгінале). Вядома, што трацкісты абвінавачвалі нашу партыю ў тым, што яна вядзе справу да «тэрмідору», гэта значыць да краху рэвалюцыі.

Што вышла з гэтага прароцтва, можна бачыць хаця-б з фактаў, якія адносяцца да выкананьня першай пяцігодкі, і з задач, намечаных намі на другую пяцігодку.

У той-жа час, з другога, з правага флянгу, жаласьлівым голасам паўтаралі прыкладна наступнае: «У тым-та і бяда, што ўсё тое, што мы будуем, усе гэтыя фабрыкі і заводы могуць у хуткім часе дастацца белагвардзейцам». Можа быць, сякія-такія дурненькія белагвардзейцы на што-небудзь і разьлічвалі па гэтым выпадку, але тым больш расчараваньне павінна было напаткаць іх пасьля. А па сутнасьці гэта было паўтарэньне трацкісцкай-жа мысьлі аб «тэрмідоры», толькі ў іншай форме. Вядома, што правыя ня спыніліся нават перад абвінавачваньнем партыі ў «фаенна-фэадальнай эксплёатацыі сялянства», паўтарыўшы тым самым па клёп мілюкоўцаў на ленінскую партыю.

Паданьня вытрымкі з дакумантаў і выступленьняў трацкістых і правых адзначаюць самыя характарныя элемэнты іх палітычных платформ. Праваі гэтых пляцформ настолькі відавочны, што цяпер мы абмяжуемся на іх тагочасныя заявы простым сьмехам, але ў свой час партыі прышлося вытрымаць жорсткую барацьбу з апартуністамі «левага» і правага толку.

Як-жа выглумачыць у той пэрыяд, калі партыя пасьпяхова разгортвала сацыялістычнае будаўніцтва і купка прасочвалася наперад, наперакор супраціўленьню капіталістычных элемэнтаў, што ў гэты пэрыяд у ёй знайшліся групы і на некаторы час нават даволі значныя, якія ўступілі ў барацьбу з партыяй і не шкадавалі ні слоў, ні сэйго гонару ў гэтай барацьбе?

Між тым іменна таму, што сацыялізм ужо тады зрабіў буйнейшыя поспехі, пераможна выцясьняючы рэшткі капіталізму, іменна таму зьявіліся ў нас апазыцыйныя групы, якія арганізоўвалі хісткіяі дробна-буржуазных пластоў. Гэтыя апазыцыйныя плыні як «левага», так і правага толку арганізоўвалі адпаведны лагер буржуазных элемэнтаў, якія супраціўляліся па вядомых прычынах палітыцы партыі і знаходзілі праз іх сваякасаблівае адлюстраваньне сваіх настрояў нават у нашай партыі.

Ці выпадковы той факт, што іменна ў тыя гады, калі партыя з посьпехам вынясьняла прыватны капітал з апошняга яго прытулку ў горадзе—гандлю, а таксама з саматужных прамыслаў, што іменна ў гэты пэрыяд узьнялася апазыцыя супроць палітыкі партыі на чале з Троцкім? Для прыкрыцьця сваіх буржуазных тэндэнцый Троцкі і яго прыхільнікі павінны былі карыстацца наборам «левых» фраз і «прыгожых» гэстаў. На гэтую вуду пападаліся часамі і сякія-такія наўныя ў палітыцы, але блізкія ад партыі элемэнты. Сапраўдная сутнасьць трацкісцкай «пляцформы» акрэсьлівалася нявер'ем у магчымасьць перамогі рабочай клясы над капіталістычнымі элемэнтамі ў даных умовах, нявер'ем у будаўніцтва сацыялізму ў СССР, і гэта вяло трацкістаў да фактычнай капітуляцыі перад буржуазнымі элемэнтамі. Яны былі толькі ўсяго рупарам перш за ўсё тых прыватна-капіталістычных элемэнтаў у гандлі і інш., якія іменна за пэрыяд 1925-27 г. г. хутка ішлі да дна.

Хіба выпадкова, далей, што іменна ў той пэрыяд, калі мы разгарнулі наступленьне на кулака, на апошнюю апору капіталізму ў вёсцы, іменна ў гэты пэрыяд узьнялася ў нас новая апазыцыя права-ўхіліцкага толку? На справе мы ведаем, што гэта апазыцыя была, перш за ўсё, ізаасабленым енкам гінучых буржуазна-кулацкіх элемэнтаў нашай вёскі. Між тым супраціўленьне кулацтва і зьвязанай з ім буржуазнай інтэлігенцыі было на столькі вялікае, асабліва ў 1928-1929 г.г., што права-апартуністычную апазыцыю ўзначальвалі тады відныя члены нашай партыі.

Вынікі барацьбы з апартуністамі у абедзьвюх яго галоўных рознавіднасьцях жыцьцём у апошнім ужо падведзены.

Трацкізм заняў месца авангарду буржуазнай контр-рэвалюцыі, стаўшы для яе адным з пастаўшчыкоў ідэй для барацьбы з пралетарскай рэвалюцыяй. Правы апартунізм, як найбольш адкрытае адлюстраваньне буржуазнага ўплыву на пралетарыят, стаў адным з галоўных пастаўшчыкоў ідэалёгічных каштоўнасьцяў для нашых клясавых ворагаў. Партыя, выпрацоўшы абодвы гэтыя анты-ленінскія ўхілы, паставіла ў свой час пытаньне аб несумяшчальнасьці прабываньня ў партыі як трацкістаў, так і правых апартуністаў.

У барацьбе з анты-ленінскімі плынямі партыя загартавалася, вырасла і ўзьнялася ашчэ на адну ступеньку. Гэта адна з рашаючых прадпасылак далейшых нашых перамог.

II. Палітычная ўстаноўка другой пяцігодкі

Палітычная ўстаноўка другой пяцігодкі дана ў тэзісах у наступнай фармулёўцы:

«Вялізарныя прыродныя багацьці краіны, бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, узрастаючая актыўнасьці шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў і правільная лінія партыі поўнасьцю забясьпечваюць такое разгорнутаньне прадукцыйных сіл сацыялістычнай гаспадаркі ў другім пяцігодзьдзі, на аснове якога будуць канчаткова ліквідаваны капіталістычныя элементы ў СССР. Канфэрэнцыя лічыць, што асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул», і «ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Прыведзеныя словы выказваюць самы галоўны элемент палітычнай ўстаноўкі другой пяцігодкі.

Марксызм-ленінізм вучыць таму, што сацыялізм—гэта зьнішчэньне клясаў, што сацыялізм—гэта стварэньне бясклясавага грамадзтва. Такім чынам, у прыведзеных словах сфармулявана задача пабудовы сацыялізму.

Ці правільна тут пастаўлена задача ў адносінах клясаў? Ці ажыцьцяўлима задача ліквідацыі клясаў так, як яна пастаўлена ў тэзісах ЦК? Мне здаецца, ня толькі правільна і ня толькі ажыцьцяўлима гэта задача, але адзіна такая палітычная пастаноўка задач другой пяцігодкі і выцякае з палітыкі партыі, з марксызму.

Галоўнае пытаньне, якое павінна быць пры гэтым разгледжана, заключаецца ў тым, наколькі правільна, што ў другой пяцігодцы мы можам паставіць сабе задачу канчатковай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў. У гэтым соль пытаньня.

Калі з гэтага канца ўзяцца за разгляд пытаньня аб клясах у наступным пяцігодзьдзі, то тады, і толькі тады, можна канкрэтызаваць пастаноўку пытаньня і атрымаць яны, і бясспрэчны для бальшавіка адказ.

На самой справе разьбярэмся ў асноўных фактах.

Прыняты партыяй народна-гаспадарчы плян на 1932 г. мяркуе, што ў народным даходзе Савецкага Саюзу ўжо да канца першай пяцігодкі ўвесь прыватны сэктар будзе займаць менш 10 проц. Наступны факт. У нас ужо звыш 60 проц. калектывізаваных сялянскіх гаспадарак і ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што пастаўленая партыяй задача ў 1932-33 г. у асноўным скончыць калектывізацыю ў СССР будзе выканана. А гэта-ж значыць, што ўжо на працягу двух бліжэйшых год, на аснове суцэльнай калектывізацыі будзе ажыцьцёўлена ліквідацыя асноўнай часткі капіталістычных элемэнтаў вёскі. Нарэшце, дадаўце да гэтага, што капіталістычныя элементы ў буйнай прамысловасьці ўжо даўно пайшлі да дна, а ў дробнай прамысловасьці, і ў гандлі роля іх хутка скарачаецца. Значыцца, ня можа быць ніякіх сумненьняў, што партыя ў другой пяцігодцы можа і павінна паставіць перад сабой задачу канчатковай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў.

Але, гавораць нам: капіталістычныя элемэнты, калі ласка, ліквідуйце канчаткова, але як-жа з ліквідацыяй клясаў наогул? Між тым, у такой пастаноўцы пытаньня ёсьць грубая ўнутраная супярэчнасьць, якая видзе да вялікай блытаніны.

Як вядома, асноўная задача сацыялізму заключаецца ў зьнішчэньні капіталізму, знішч кажучы ў зьнішчэньні клясаў, г. зн. у зьнішчэньні эксплёатацыі чалавека чалавекам. З гэтага вынікае, што поўная ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў азначае ліквідацыю клясы эксплёататараў, а без эксплёататараў няма і эксплёатаваных.

У тэзісах гаворыцца аб неабходнасьці «поўнага зьнішчэньня прычын, якія спараджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю». У чым гэта павінна выяўляцца?

Мы, бальшавікі, добра ведаем у чым гэта выяўляецца, бо бальшавікі вялі сацыялістычную рэвалюцыю, якая пачынаецца з пераходу ў прамадзкія рукі, у рукі дзяржавы сродкаў вытворчасьці, а іменна—зямлі, фабрык, заводаў і інш. Асноўнай эксплёатацыі чалавека чалавекам зьяўляецца прыналежнасьць асобным людзям гэтых сродкаў вытворчасьці і адсутнасьць іх у іншых людзей. Гэта падзяленьне людзей на клясы і спараджае эксплёатацыю.

Мы ведаем, што ў адносінах буйнай прамысловасьці і зямлі працэс пераходу сродкаў вытворчасьці ра ўласнасьць дзяржавы адбыўся даўно. Ён адбываецца цяпер і разам з канчатковай ліквідацыяй капіталістычных элемэнтаў поўнасьцю скончыцца і ва ўсіх іншых галінах гаспадаркі. Тым самым зьнішчэньне прычын, якія спараджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, будзе ажыцьцёўлена.

Пасьля ўсяго сказанага ясна, што поўная ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і поўнае зьнішчэньне пры-

(Працяг дакладу на 2-ой старонцы)

Наперад, да другой пяцігодкі пабудовы сацыялізму

Скончылася XVII партыйная канфэрэнцыя.

Канфэрэнцыя прыняла важнейшыя пастановы аб рабоце прамысловасьці ў апошнім, завяршальным годзе першай пяцігодкі і аб пляне другой пяцігодкі. Пастановы канфэрэнцыі зацьверджаны пленумам ЦК.

6 год назад на XIV партыйным зьезьдзе тав. Сталін высунуў лёзунг сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны, якая толькі што выйшла з адбудоўчага пэрыяду. Пастановы XIV зьезду прымаліся і потым праводзіліся ў жыцьцё ў жорсткай барацьбе з зіноўеўскай апазыцыяй, а потым трацкісцка-зіноўеўскім апазыцыйным блёкам, якія прыкрываючыся «левай» фразай, на справе капітулявалі перад труднасьцямі пабудовы сацыялізму ў нашай краіне, абвясьцілі гэтую задачу немагчымай і ў асобе сваіх найбольш адкрытых прадстаўнікоў проста прапаставілі лёзунгу індустрыялізацыі лёзунг аграрызацыі, замацаваньня эканамічнай адсталасьці нашай краіны, ператварэньня яе ў аграрны прыдатак міжнароднага капіталізму.

XV зьезд канстатаваў аграмадныя посьпехі палітыкі індустрыялізацыі. XV зьезд услед за XV канфэрэнцыяй рубам паставіў пытаньне аб тэмпах сацыялістычнай індустрыялізацыі, аб такіх тэмпах, якія давалі-б нам магчымасьць дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. XV зьезд завастрыў увагу партыі на развіцьцё цяжкай індустрыі ў першую чаргу, як асновы і базы сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Але зьезд паставіў перад партыяй другую важнейшую задачу—сацыялістычнай рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі, пераходу ад дробнай і драбнейшай селянскай гаспадаркі да буйнага аграмадзкага земляробства. XV зьезд выключыў з партыі трацкісцка-зіноўеўскую апазыцыю, якая скацілася на пазыцыю контрэвалюцыйнага меншавізму.

Але правядзеньне ў жыцьцё пастаноў зьезду аб бальшавіцкіх тэмпах індустрыялізацыі, аб разьвіцьці цяжкай індустрыі ў першую чаргу, аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, шырокім будаўніцтве саўгасаў і калгасаў і ўзмацненьні наступленьня на кулака натрапіла на жорсткае супраціўленьне правай апазыцыі, якая аформілася, як агентура кулака ўнутры партыі, і фактычна пропіпаставіла шляху сацыялістычнай рэканструкцыі, намечанаму партыяй, шлях капіталістычнай рэстаўрацыі. У момант самай жорсткай і абвостраная барацьбы з правай апазыцыяй, партыя на XVI партыйнай канфэрэнцыі, на аснове пастаноў XV зьезду, прыняла плян першай пяцігодкі. XVI зьезд увойдзе ў гісторыю нашай партыі, як зьезд сацыялістычнага наступленьня, як зьезд суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, як першы зьезд пэрыяду сацыялізму, у які ўступіла савецкая краіна, як зьезд поўнага ідэйнага выкарыньня і разгрому правага апартунізму, погляды якога зьезд прызнаў несумяшчальнымі з прыналежнасьцю да партыі.

Праўда, пасьля зьезду супроць партыі стварыўся новы апартуністычны блёк з асколкаў правага апартунізму і трацкісцкага прыхвосьця—так званы права-«левацкі» блёк. Характэрнымі асаблівасьцямі блёку былі бяспрынцыпнасьць, двурушнітва і праваапартуністычная пляцформа. Адкінуўшы прэч з дарогі кучку абанкрутаваных капітулянтаў, праводзячы далей непрымірымую барацьбу на два фронты, супроць правага і «левага» апартунізму і супроць прымірэнцтва, партыя падышла да XVII партканфэрэнцыі з новымі вялізарнымі посьпехамі, якія забясьпечваюць ажыцьцяўленьне асноўных лёзунгаў XVI партыйнага зьезду аб выкананьні пяцігодкі за 4 гады і аб суцэльнай калектывізацыі ўсяго Савецкага Саюзу.

Пабудаваны фундамант сацыялістычнай эканомікі.

Магутнае разьвіцьцё цяжкай індустрыі, асабліва машынна-будаўніцтва, ужо стварыла базу для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Пасьля ўпартай, напружанай барацьбы партыя дабілася пералому на рашаючых вучастках прамысловасьці, адставаньне якіх машней за ўсё ад бівалася на выкананьні пляну пяцігодкі, на вучастках вугалю і мэталю.

Дасягнуты рашаючыя посьпехі ў аўладаньні тэхнікай важнейшых вытворчасьцяў, якія вызваляюць нас ад замежнай залежнасьці.

Дасягнуты некаторыя посьпехі ў барацьбе за аздараўленьне чыгуначнага транспарту, які зьяўляецца зараз найбольш вузкім месцам нашай народнай гаспадаркі. Дасягнута паскорань не разьвіцьця лёгкай індустрыі.

Разгортваецца савецкі гандаль, паляпшаецца матар'яльнае становішча шырокіх рабочых і працоўных мас. Суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва праведзены ў асноўным у рашаючых збожжавых раёнах нашай краіны. Усіх гэтых посьпехаў партыя дабілася на аснове барацьбы з апартунізмам і на аснове канкрэтнага бальшавіцк

АБ ДРУГОИ ПЯЦІГОДЦЫ

Даклад тав. Молатава

чын, якія спараджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, азначае тым самым і ліквідацыю клясаў наогул. Калі няма капіталістычных элементаў, т. зн. няма эксплёататараў і калі поўнасьцю ліквідаваны крыніцы клясавай розьніцы, аб якіх-жа клясах можна тады гаварыць? Тады і аб клясах ва ўласным сэнсе слова ўжо гаварыць нельга. Значыць той хто ставіць задачай другой пяцігодкі поўную ліквідацыю капіталістычных элементаў, той намічае разам з тым павінен ста віць і задачу ліквідацыі клясаў наогул.

Зразумела, ліквідацыя капіталістычных элементаў зьвязана з вялізарнымі труднасьцямі, з перамаганьнем шасёных спроб супраціўленьня з боку кулацтва і буржуазных элементаў наогул. Клясавая барацьба ня толькі ня спыняецца, але асабліва на асобных вучастках і ў асобных пэрыяды можа і будзе значна абвастрацца. Поўная ліквідацыя капіталістычных элементаў магчыма толькі на аснове давяньня да канца палітыкі бальшавіцкага разгорнутага наступленьня, якое перамагае ўсе і ўсякія труднасьці і апортуноўае такой рабочай клясы шырокія масы працоўных вёскі супроць кулака, супроць усіх буржуазна-капіталістычных элементаў.

У трактаваньні пытаньня аб ліквідацыі клясаў, да гэтага часу яшчэ нямала элементаў схематызму, які ня мае нічога агульнага з марксызмам і яго тэорыяй разьвіцьця. Але схематычны ўяўленьні ўядуць да вялікай блытаніны і грубых памылак.

Таму трэба больш падрабязна спыніцца на задачы ліквідацыі клясаў.

Пачну з пытаньня аб рабочай клясе.

Марксізмам павінна быць ясна, што з тых часоў, калі рабочая класа ўзяла ўладу ў свае рукі і падначаліла сабе ўсе сродкі вытворчасьці, буйную прамысловасьць, зямлю, транспарт і інш., з тых часоў гэта ўжо не пралетарыят у простым сэнсе слова, якім ён быў у капіталістычнай грамадзе. Пралетарыят у капіталістычнай грамадзе пазбаўлен сродкаў вытворчасьці і таму скаваны ланцутамі буржуазнай эксплёатацыі. Становішча пралетарыяту пры капіталізме—становішча прытнечанай і эксплёатуемай грамадзкай клясы. Разам са зьнікненьнем улады буржуазіі і адняцьцем у яе сродкаў вытворчасьці рабочая класа становіцца пануючай сілай у дзяржаве. З гэтага моманту яна пачынае ліквідацыю капіталістычных элементаў і падрыхтоўвае глебу для ліквідацыі клясаў наогул.

З таго часу, як рабочая класа нашай краіны атрымала ў Кастрычніку 1917 году вялізарнейшую ў гісторыі ўсяго свету перамогу над буржуазіяй, з таго часу вось ужо другое дзесяцігодзьдзе рабочая класа СССР ня толькі вырвалася з капіталістычнага рабства, але і стала пануючай клясай, будуючай новую сацыялістычную грамаду. Гістарычная роля пралетарыяту заключаецца ня толькі ў тым, што ён зьяўляецца магільшчыкам буржуазнай грамады, але і ў тым, што зьяўляецца будаўніком новай, сацыялістычнай грамады. Тым самым дзяржава, якую стварае рабочая класа пасьля сваёй перамогі, выкарыстоўваецца ёю для таго, каб ажыцьцявіць ліквідацыю капіталістычных элементаў, а разам з тым і клясаў наогул. Па меры зьнішчэньня капіталістычных элементаў вырываюцца карэньні ўсякага клясавага дзяленьня ў грамадзе, і, значыць, падрыхтоўваецца ліквідацыя ўсіх клясаў, а тым самым—і самой рабочай клясы. Рабочая класа нашай краіны прайшла ўжо вялікі шлях у справе ліквідацыі капіталістычных элементаў. Наступнае пяцігодзьдзе будзе тым пэрыядам, калі пытаньне аб ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў наогул стане ва ўвесь рост, ва ўсім абъёме.

У ажыцьцяўленьні задачы ліквідацыі клясаў рабочая класа выконвае асабліваю ролю. Як класа пануючая, рабочая класа кіруе ўсім сацыялістычным будаўніцтвам, уключаючы ліквідацыю капіталістычных элементаў і перабудову дробнай сялянскай гаспадаркі на сацыялістычнай базе. Больш таго: і сама рабочая класа ў працэсе гэтай барацьбы і сацыялістычнай будоўлі пераўтвараецца, вылучаючы са свайго асяродзьдзя ўсё больш актыўных і сьвядомых будаўнікоў сацыялізму, загартоўваючы сябе ў барацьбе з капіталістычнымі элементамі і ў барацьбе за перамаганьні буржуазных і дробна-буржуазных на строю як у сваім асяродзьдзі, так і ва ўсёй масе працоўных.

Зараз аб нашым сялянстве, правільней аб працоўнай масе сялянства, паколькі пытаньне аб капіталістычных элементах вёскі было пастаўлена вышэй.

У становішчы сялянства з часоў Кастрычніцкай рэвалюцыі адбыліся карэнныя зьмены, якіх нельга не бачыць. Асабліва і перш за ўсё гэта ад носіцца да калгасных масаў вёскі.

Ня гледзячы на тое, што працоўнае сялянства стала на шлях суцэльнай калектывізацыі ўсяго прыкладна два з паловай гады назад, для нас ясна, што яно ўжо канчаткова стала на шлях сацыялізму. У барацьбе з кулаком, пад кіраўніцтвам рабочае клясы, калгасьнікі,—а іх ужо мільёны—у рашаючай сваёй масе цьвёрда сталі ў рады будаўнікоў сацыялізму.

Яны, ведома, памятаюць добра, чым яны былі да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яны ня могуць забыць таго, што пры ўладзе буржуазіі і абшарнікаў яны былі тымі, якіх бязьлітасна эксплёатавалі і прыгнячалі, над якімі з палкай сталі ўраднікі і немскія на чальнікі і якія былі часта ў лапах у попаў і іншых «духоўных айцоў».

Параўноўваючы сваё становішча з паўгалодным становішчам рабочага і з умовамі жыцьця беспрацоўных пры панаваньні капіталу і ня ведаючы шляхоў да палепшаньня свайго жыцьця, селянін трымаўся за сваю дробную ўласнасьць, выпрацоўваючы на гэтай глебе мацнейшыя дробна-уласьніцкія звычкі.

У пэрыяд другой пяцігодкі ўся працоўная маса вёскі будзе ахоплена сацыялістычнай перабудовай, перабудовай гаспадаркі на базе калектыўнаму і высокай машыннай тэхніцы. Гэта ня можа адбывацца гладка, самацёкам,—гэта можа адбыцца толькі ў жорсткай барацьбе з рэшткамі капіталізму ў вёсцы, толькі ў барацьбе за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і тым самым ў барацьбе за пэратэрэньне ўчарайшых дробных уласьнікаў, а сёньняшніх і заўтрашніх калгасьнікаў у сьвядомых і актыўных будаўнікоў сацыялізму.

Дробна-буржуазныя хістаньні ў сялянскай масе яшчэ будуць, яны няўхільны ў асобныя моманты і ў асобных раёнах. Гэтыя хістаньні асабліва будуць давець сябе ведаць там, дзе нашая работа слабая, а кулак і буржуазныя элементы актыўны.

Але няма патрэбы даказваць, што сучаснае калгаснае сялянства, а ў бліжэйшую пару гадоў ужо асноўная яго маса—не старыя сяляне—аднаасобнікі дарэвалюцыйнага часу. За гады рэвалюцыі, і асабліва за гады шпаркага разгортаньня суцэльнай калектывізацыі вёскі, адбылася глыбокія зьмены ў сялянстве, і селянін выглядае ўжо іншым, усё больш в цёмнага, адсталага і забітага працаўніка зёскі ператвараючыся ў актыўнага будаўніка—калгасьніка. На гэтай аснове растуць рады актыўных і сьвядомых будаўнікоў сацыялізму ў вёсцы настолькі шпарка, што ў другім пяцігодзьдзі,—можна гэта з упэўненасьцю сказаць,—уся працоўная маса сялянства будзе арганізавана ў калгасы і тым самым прыдзе канец панаваў шай у вёсцы на працягу шмат стагодзьдзяў дробнай уласнасьці.

Поўнасьцю ліквідаваць капіталістычныя элементы ў вёсцы—значыць завяршыць справу сучэльнай калектывізацыі. Гэта можа быць ажыцьцяўлена толькі ў безупынным барацьбе з кулацтвам і ў барацьбе за сацыялістычнае пераўтваньне калгаснай масы, за ўзмацненьне ў калгасах пралетарскай дысцыпліны, за рашучае палепшаньне арганізацыі працы калгасьнікаў. Арганізацыя гэтай барацьбы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ёсьць наша галоўная справа ў вёсцы. Рэзультатам пасьпяховай барацьбы пад гэтым сьцягам будзе ліквідацыя ня толькі капіталістычных элементаў, але і дробна-ўласьніцкай гаспадаркі ў вёсцы. Гэта і азначае, што перад намі стаіць задача ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў наогул.

Наш рабочы і селянін-калгасьнік ужо цяпер у масе сваёй стаяць у радах актыўных будаўнікоў сацыялізму. Задача поўнай ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў наогул разам з тым зьяўляецца задачай пераўтварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавай сацыялістычнай грамады. Ажыцьцяўленьне задачы—задачы стварэньня бясклясавай сацыялістычнай грамады ў другім пяцігодзьдзі ператвараецца ў практычную задачу. Яна вырастае з пасягнутых ужо посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва і з сукупнасьці пастаўленых другой пяцігодкай задач пабудовы сацыялізму.

Па пытаньні аб дзяржаве.

Пытаньне аб дзяржаве спэцыяльна не абсьвятляецца ў нашых тэзісах. І гэта зразумела.

Ставячы задачу ліквідацыі клясаў у другой пяцігодцы, мы яшчэ ні ў якім выпадку ня можам і не павінны ставіць пытаньня аб непатрэбнасьці аб адміраньні дзяржавы. Наадварот. На даной стадыі справа ідзе аб умацаваньні пралетарскай дзяржавы, аб узмацненьні яе магутнасьці.

Гэта выцякае з стаячых яшчэ перад намі задач ліквідацыі капіталістычных элементаў, перасячэньня ўсіх і ўсялякіх контрэрэвалюцыйных вылазак буржуазных элементаў супроць улады рабочае клясы, з вялізарных арганізацыйна-выхаваўчых задач у адносінах перабудоўзаючайся на новай базе працоўнай сялянскай масы і ў цэлым усёй масы працоўных гораду і вёскі.

Няма чаго ўжо гаварыць аб тым, што пры наяўнасьці вонкавага капіталістычнага абкружэньня горшым выглядам апартунізму было-б якое-не будзь паслабленьне магутнасьці пралетарскай дыктатуры. З растучага абвастраньня супярэчнасьцяў паміж краінай будуючага сацыялізму і капіталістычным сьветам можна зрабіць адзіны вывад—аб усямерным узмацненьні пралетарскай дзяржавы, каб узьняць яе сілы ня толькі ў адносінах унутранага клясавага ворага, але і ў адносінах варожых яму клясавых сіл імпэрыялізму.

Лепшым тлумачэньнем гэтага пытаньня, як і ўсіх карэнных задач будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне, зьяўляецца такі асноўны дакумант, як кніга Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя». Разам з адпаведнымі літаратурнымі дакумантамі Маркса і Энгельса мы маем тут ключ да разуменьня карэнных задач нашага будаўніцтва, у прыватнасьці ў адносінах другой пяцігодкі.

Ленін падрабязна тлумачыць асаблівасьці першай, ніжэйшай фазы камуністычнай грамады (сацыялізму), у якую мы ўжо ўступілі, але якая далёка не канчаецца і ў другім пяцігодзьдзі. Характарнай асаблівасьцю гэтай фазы, фазы сацыялізму, вызьначаецца захаваньне яшчэ рэшткаў буржуазнай дзяржавы ў выглядзе так званага «буржуазнага права».

Вось што гаворыцца ў Леніна наконт гэтага ў «Дзяржаве і рэвалюцыі»:

«Роўнае права,—гаворыць Маркс, мы тут сапраўды маем, але гэта яшчэ «буржуазнае права», якое як і кожнае права, **мяркуе няроўнасьць.** Кожнае права ёсьць прыстасаваньне **аднолькавага** маштабу да **розных** людзей, якія на справе неаднолькавы, ня роўны адзін аднаму; і таму «роўнае права» ёсьць парушэньне роўнасьці і няправядлівасьць». На самай справе, кожны атрымлівае, адпрацаваўшы роўную з другімі долю грамадзкай працы,—роўную долю грамадзкай вытворчасьці (за паказанымі вылічэньнямі).

А між тым паасобныя людзі ня роўны: адзін мацней, другі слабей; адзін жанаты, другі не, у аднаго больш дзяцей, у другога менш, і г. д.

«...Пры роўнай працы,—заключае Маркс,—значыцца, пры роўным удзеле ў грамадзкім спажывецкім фондзе, адзін атрымлівае на самай справе больш, чымся другі, стане багацей другога і г д. Каб ухіліцца ўсяго гэтага, права, замест таго, каб быць роўным, павінна-бы быць няроўным».

Справядлівасьці і роўнасьці, значыцца, першая фаза, камунізму даць яшчэ ня можа: розьніца ў багацьці застанецца і розьніца несправядлівая, але нематчыма будзе эксплёатацыя чалавека чалавекам, бо нельга захапіць **сродкі вытворчасьці,** фабрыкі, машыны, зямлю і інш. у прыватную ўласнасьць. Разьвязаючы дробна-буржуазны нязоны сказ Ласаля аб «роўнасьці» і «справядлівасьці» наогул, Маркс паказвае ход разьвіцьця камуністычнай грамады, якая вымушана спачатку зьнішчыць **толькі** тую «несправядлівасьць», што сродкі вытворчасьці захоплены паасобнымі асобамі, і якія **не ў стане** адразу зьнішчыць і далейшую несправядлівасьць, якая складаецца ў разьмеркаваньні прадметаў спажываньня «па рабоце» (а не па патрэбнасьцях).*)

І далей Ленін падкрэсьлівае, што на ват пасьля ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў наогул дзяржава будзе адмірань толькі паступова, на працягу доўгага пэрыяду.

«Дзяржава адмірае, паколькі капіталістаў ўжо няма, клясаў ўжо няма, **прыдушаць таму якую-б то ні было клясу нельга.**

Але дзяржава яшчэ не адмерла зусім, бо застаецца ахова «буржуазнага права», якое асьвятляе фактычную ня роўнасьць. Для поўнага адміраньня дзяржавы патрэбен поўны камунізм».**)

Растлумачваючы ролю дзяржавы пасьля пралетарскай рэвалюцыі, Ленін зазначае на заяву Энгельса аб тым, што «Камуна ня была ўжо дзяржавай ва ўласным сэнсе». Ленін гаворыць таксама аб тым, што пралетарская дзяржава ёсьць паўдзяржава, г. зн. ў аснове сваёй адрозьніваецца **ад буржуазнай дзяржавы з яе панаваньнем** меншасьці (эксплёататараў) над вялізарнай большасьцю (эксплёатуемых). У сваю чаргу пралетарская дзяржава ёсьць арганізацыя панаваньня рабочай клясы і разьвіцьця пралетарскай дэмакратыі, т. зн. усё больш актыўнага ўдзелу працоўных мас гораду і вёскі ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве.

У паданых словах Леніна і Маркса падкрэсьліваецца наяўнасьць няроўнасьці ў грамадзе і пасьля вызваржэньня ўлады буржуазіі.

Першай задачай сацыялістычнай рэвалюцыі зьяўляецца зьнішчэньне магчымасьці эксплёатацыі чалавека чалавекам, т. зн. зьнішчэньне захопу сродкаў вытворчасьці прыватнымі ўласьнікамі, але няроўнасьць у грамадзе і пасьля гэтага яшчэ доўга застацца, бо ўжываюцца розныя меркі да розных людзей, якія паміж сабой няроўны і не знаходзяцца ў зусім аднолькавых умовах. Гэта няроўнасьць зьнішчацца далёка не адразу. І яно ня можа быць зьнішчана да таго часу пакуль застацца неабходнасьць укываньня так званага «буржуазнага права», якое складаецца ў разьмеркаваньні прадметаў спажываньня «па рабоце» (а не па патрэбнасьцях). За дзяржавай застацца «ахова «буржуазнага права», асьвятляючага фактычную няроўнасьць».

Асноўным адрозьніваньнем пралетарскай дзяржавы ад буржуазнай дзяржавы зьяўляецца, аднак, тое, што «права» ва ўмовах пралетарскай дыктатуры ахоўвае інтарэсы працоўнай большасьці і накіравана на прыдушэньне варожых пралетарыяту клясавых элементаў. Таму перад рабочай клясай і ўсёй працоўнай масай і стаіць на данай стадыі задача ўмацаваньня магутнасьці пралетарскай дыктатуры, задача ўзмацненьня магутнасьці пралетарскай дзяржавы. Толькі пры гэтай умове і магчыма поўная ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул, а значыцца—пабудова бязклясавай сацыялістычнай грамады, у працэсе разьвіцьця якой паступова і адамрэ дзяржава.

Перайду да пытаньня аб узаемаадносінах гораду і вёскі, як яны складаюцца ў пэрспэктывах другой пяцігодкі.

Перш, аднак, працытую тое, што гаварыў Энгельс у «Жыльлёвым пытаньні» наконт гэтага. Вось яго словы:

«Чысьцейшай ўтопіяй зьяўляецца жаданьне ператварыць сучасную буржуазную грамаду, тобач з жаданьнем захаваць сялянства як гэткае. Толькі магчыма больш роўнамернае разьмеркаваньне насельніцтва па ўсёй краіне, толькі шчыльная сувязь індустрыі з земляробчым вытворствам, побач з необходным пашырэньнем сродкаў зносін—пры зьнішчэньні капіталістычнага спосабу вытворства, што зьяўляецца прадпасылкай,—у стане вырваць сельскае насельніцтва з дазіваньнасьці і тупасьці, у якой яно амаль нязьменна праз'яве на працягу тысячагодзьдзяў».

У адпаведнасьці з гэтым зроблены вывад і ў нашых тэзісах. У тэзісах зазначаецца, што выкананьне задач другой пяцігодкі азначае стварэньне ўмоў «для поўнага зьнішчэньня прошлегласьці паміж горадам і вёскай».

Важна, аднак, тут спыніцца на пытаньні аб шляхах зьнішчэньня гэтай проціглегласьці. З аднаго боку, гэта залежыць ад гораду, ад індустрыі і інш. З другога—пэта залежыць ад вёскі, якая перабудоўваецца на новай калгаснай аснове (на данай стадыі—у арцельнай форме).

Неабходна асоба спыніцца на тых шляхох, на якіх ідзе сацыялістычная перабудова нашай сельскай гаспадаркі. Вядома, што гэта перабудова адбываецца на базе калектывізацыі. Вядома таксама, што калгасы ёсьць адна з рознастайнасьцяў каапэрацыі, а менна—вышэйшая форма каапэрацыі, вытворча-сацыялістычны яе тып.

Адрозьніваньне калгасу ад дзяржаў на - сацыялістычных прадпрыемстваў мае вялізарнае палітычнае і практычнае значэньне. Каапэрацыйная аснова калгасу ў яго арцельнай форме, дабраахвотнасьць удзелу ў ім і разам з тым стварэньне пры падтрыманьні дзяржавы і пад яе кіраўніцтвам новай, вышэйшай тэхнічнай базы калгаснай гаспадаркі у максымальнай меры палягчае пераход сялянскай масы (праз рад ступеней разьвіцьця саміх калгасаў) да сацыялізму. Гэта выцякае з вядомага ленінскага каапэрацыйнага пляну.

VI зьезд саветаў у 1931 годзе падкрэсьліў розьніцу паміж калгасамі і саўгасамі. Ён асоба адзначыў, што «саўгасы зьяўляюцца дзяржаўнымі прадпрыемствамі, дзе дзяржава зьяўляецца поўным гаспадаром». Разам з тым тут-жа сказана, што «гаспадарамі калгасаў зьяўляюцца калгасьнікі». Розьніца відавочна. Гэта розьніца падкрэсьлена партыяй для таго, каб не дапускалася направільнага зьмешваньня саўгасаў з калгасамі і наадварот, што, як ведома, мела месца ў радзе выпадкаў на практыцы. Гэтым рашэньнем у дастаткавай меры падкрэсьлены каапэрацыйны характар калгасаў і сваяасаблівасьць шляхоў сялянства да сацыялізму.

Сваяасаблівасьць шляхоў да сацыялізму рабочай клясы і сялянства відавочна. У моц асаблівых умоў свайго клясавага становішча рабочая класа ідзе наперадзе сялянства, праз вы шэйшыя на данай стадыі формы сацыялістычнай гаспадаркі. З асаблівасьцяй становішча працоўнай масы сялянства ў мінулым выцякаюць асаблівасьці яго шляхоў (рад дадатковых пераходных ступеней, вялікія тэрміны і г. д.) да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. І рабочы, і сялянін-калгасьнік—будаўнікі сацыялізму. І рабочы, і сялянін у масе сваёй будуць пераўтварацца ў наступным пяцігодзьдзі ва ўсё больш актыўных і сьвядомых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Сваяасаблівасьць шляхоў іх сацыялістычнага развіцьця ня толькі не затрудняе, але толькі яно і можа забясьпечыць канчатковую перамогу сацыялізму, калі, нарэшце, ўся розьніца паміж рабочымі і сялянамі цалкам зьнікне.

Будаўніцтва сацыялізму аднак азначае на працягу ўсяго бліжэйшага пэрыяду захаваньне, а часамі і значнае абвастрэньне на паасобных вучастках барацьбы, у самых рознастайных яе праявах. Гэта адносіцца да гораду, дзе ў асноўным ліквідаваны ўжо капіталістычныя элементы, і адносіцца ў яшчэ большай ступені да вёскі, дзе ліквідацыя капіталістычных элементаў яшчэ не закончана.

Усё сказанае аб палітычнай установе цы другой пяцігодкі непарыўна зьвязана з задачамі **палепшаньня матар'яльных умоў жыцьця** рабочых і сялянскіх мас.

Ліквідацыя паразытычных клясавых элементаў і рост народнай гаспадаркі, накапленьні якога ідуць усё ў большай меры ў распараджэньне працоўных, павінны забясьпечыць у другім пяцігодзьдзі значна больш хуткі ўздым матар'яльных і культурных умоў жыцьця мас. У дырэктывах аб другой пяцігодцы на гэтых задачахавострана ўвага.

Задачай другой пяцігодкі зьяўляецца падняць ня менш чым у два-пры разы супроць сучаснага ўзроўню забясьпечаньне насельніцтва асноўнымі прамысловымі і харчовымі таварамі. Такая вялізарная задача на працягу аднаго пяцігодзьдзя непасільна ня толькі ніякай буржуазнай дзяржаве, яна непасільна была і нам у першай пяцігодцы. Толькі цяпер, на аснове пераможнага ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі, на аснове таго, што мы ідзем да пераможнага завяршэньня першай пяцігодкі ў 1932 годзе,—толькі на гэтай аснове можна і павінна было па ставіць пытаньне аб далейшым, і пры тым рашучым, палепшаньні ўмоў жыцьця працоўнага насельніцтва ў другой пяцігодцы.

Указаньні тав. Сталіна на тое, што рабочыя масы жадаюць і павінны жыць лепш, што яны ў адпаведнасьці з ростам эапатрабаваньняў павінны мець магчымасьць іх здавальненьня, гэтыя ўказаньні алказваюць насьпеўшым запатрабаваньням моманту. Партыя павінна забясьпечыць посьпяховае вырашэньне задачы—ня менш, чым у два-тры разы, палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы жыцьця рабочых і працоўных вёскі за бліжэйшае пяцігодзьдзе.

Асаблівае значэньне мае справа па лепшаньня жыльлёвых умоў і ўзьяўніць цё камунальнай гаспадаркі. У дырэктывах наконт гэтага ня мае падрабязных указаньняў. Але гэта выцякае з усёй палітычнай установы тэзісаў. Жыльлёвая і камунальная справа, якая пачала разгортвацца, павінна зрабіцца выходным пунктам рашучага палепшаньня жыльлёва-бытавых умоў жыцьця, асабліва рабочае клясы.

Больш таго. Пытаньне аб рашучым падняцьці матар'яльна - бытавых умоў жыцьця працоўных у гарадох паставлена партыяй у парадак дню ўжо цяпер. Гэта — задача сёньняшняга дню. Мы ўжо маем магчымасьць зараз дабіцца не малых посьпехаў у гэтай справе. Тым з большым размахам гэтыя задачы павінны ажыцьцяўляцца ў другой пяцігодцы.

Нашы рэсурсы ў гэтых адносінах далёка яшчэ ня выкарыстаны. А яны растуць з кожным днём. Рашэньне аб арганізацыі Камісарыяту лёгкай прамысловасьці і намячаемая рэарганізацыя Наркамсобу ажыцьцяўляецца ў гэтым напрамку. Такая вялізарная задача на працягу аднаго пяцігодзьдзя непасільна ня толькі ніякай буржуазнай дзяржаве, яна непасільна была і нам у першай пяцігодцы. Толькі цяпер, на аснове пераможнага ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі, на аснове таго, што мы ідзем да пераможнага завяршэньня першай пяцігодкі ў 1932 годзе,—толькі на гэтай аснове можна і павінна было па ставіць пытаньне аб далейшым, і пры тым рашучым, палепшаньні ўмоў жыцьця працоўнага насельніцтва ў другой пяцігодцы.

Указаньні тав. Сталіна на тое, што рабочыя масы жадаюць і павінны жыць лепш, што яны ў адпаведнасьці з ростам запатрабаваньняў павінны мець магчымасьць іх здавальненьня, гэтыя ўказаньні алказваюць насьпеўшым запатрабаваньням моманту. Партыя павінна забясьпечыць посьпяховае вырашэньне задачы—ня менш, чым у два-тры разы, палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы жыцьця рабочых і працоўных вёскі за бліжэйшае пяцігодзьдзе.

Асаблівае значэньне мае справа па лепшаньня жыльлёвых умоў і ўзьяўніць цё камунальнай гаспадаркі. У дырэктывах наконт гэтага ня мае падрабязных указаньняў. Але гэта выцякае з усёй палітычнай установы тэзісаў. Жыльлёвая і камунальная справа, якая пачала разгортвацца, павінна зрабіцца выходным пунктам рашучага палепшаньня жыльлёва-бытавых умоў жыцьця, асабліва рабочае клясы.

Больш таго. Пытаньне аб рашучым падняцьці матар'яльна - бытавых умоў жыцьця працоўных у гарадох паставлена партыяй у парадак дню ўжо цяпер. Гэта — задача сёньняшняга дню. Мы ўжо маем магчымасьць зараз дабіцца не малых посьпехаў у гэтай справе. Тым з большым размахам гэтыя задачы павінны ажыцьцяўляцца ў другой пяцігодцы.

Нашы рэсурсы ў гэтых адносінах далёка яшчэ ня выкарыстаны. А яны растуць з кожным днём. Рашэньне аб арганізацыі Камісарыяту лёгкай прамысловасьці і намячаемая рэарганізацыя Наркамсобу ажыцьцяўляецца ў Камісарыят харчовай прамысловасьці адпавядае задачам узмоцненай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў для задавальненьня растучых матар'яльных і культурных патрэб мас.

Асаблівае значэньне, асаблівую актуальнасьць для данага моманту, але ня толькі для данага году, мае пытаньне аб разгортваньні таваразвароту, разгортваньні савецкага гандлю, і ў першую чаргу павялічэньне розьніцы. Без разгортваньня сеткі крам і магазынаў, пасьля таго, як прыватнаспэкулянцкі гандаль агарнуўся і праявіцягвае скарачацца, нельга забясьпечыць растучых патрэб рабочых і сялянскіх мас.

У пачатку нэп'а Ленін казаў, што важнейшым лёзунгам партыі зьяўляецца лёзунг «вучыцеся гандляваць». Ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу мела ў свой час вялікае значэньне для ўздыму народнае гаспадаркі, для ўзмацненьня пралетарскага кіраўніцтва вёскай і для палепшаньня забясьпячэньня насельніцтва. Але і зараз, у новых умовах і з новым зьместам, гэты лёзунг мае актуальнейшае значэньне.

У пачатку нэп'а базай для разгортваньня гандлю была ня толькі наша сацыялістычная прамысловасьць, але і прыватна - сялянскі, а часткова і кулацкі сэктар вёскі. Разгортваньне гандлю ў тых умовах вяло разам з тым да некаторага адраджэньня капіталістычных элементаў. Гэта падкрэсьлівала неабходнасьць для камуністаў правядзеньня лёзунгу «вучыцеся гандляваць», каб паб'іць капіталістычныя элементы і ў гэтай справе. У асноўным гэтая задача была выканана.

З таго часу становішча карэнным чынам зьмянілася. Базай для разгортваньня гандлю ў сучасных умовах зьяўляецца, перш за ўсё, у многім вырасшая сацыялістычная прамысловасьць і пануючыя ў вёсцы сацыялістычныя формы—калгасы і саўгасы.

Гэта значыць, што база для разгортваньня таваразвароту па-савецкаму значна ўзмацнілася, і, значыць, стварыліся лепшыя ўмовы на далейшым узмацненьні пралетарскага кіраўніцтва вёскай і ўзрасьлі нашы магчымасьці ў справе палепшаньня забясьпячэньня мас прамысловымі і спажывецкімі таварамі. Трэба асабліва адзначыць, што толькі на аснове разгортваньня савецкага гандлю, і, перш за ўсё, разгортваньня розьніцы, стане магчымым ажыцьцяўленьне адмены нармаваньня выдачы прадуктаў і тавараў, якія мы вымушаны былі часова ўстанавіць, ня гледзячы на адмоўныя бакі гэтай справы (злоўжываньне, бюракратызм і інш.). Тым шпарчэй мы створым прадпасылкі для адмены нармаваньня водпуску тавараў, чым актыўней ужо цяпер будзем працаваць над палепшаньнем і разгортваньнем савецкага гандлю, і ў першую чаргу розьніцы.

Ставячы ў другой пяцігодцы задачу значна больш шпаркага ўздыму дабрабыту рабочых і сялянскіх мас, мы павінны разам з тым даць адпор разважаньням накшталт таго, што «сацыялізм — вытворчасьць для спажываньня». Аднабокасьць і няправільнасьць гэтай фармулёўкі відавочна. У аснове гэтая памылка блізка рас крытываванаму Марксам лассалеўскаму прынцыпу — «поўны прадукт працы рабочаму». На справе гэты прынцып неажыцьцяўлімы і яўна фальшывы, бо рабочы ніколі не адмаўляў і ня будзе адмаўляць неабходнасьці выдзяленьня часткі прадукцыі сваёй працы для агульна - дзяржаўных патрэб, для стварэньня рэзэрву і г. д. Вузка — спажывецкі падыход да сацыялізму не адпавядае інтарэсам сацыялістычнай дзяржавы і тэорыі ленінізму. Палепшаньне спажывецкіх патрэб мас знаходзіцца ў непарыўнай сувязі са зьнішчэньнем паразытычных клясавых элементаў. Спробы адарваць пытаньне спажываньня ад падняцьця вытворчасьці, ад правядзеньня палітыкі індустрыялізацыі і, значыць, падняцьця ў першую чаргу цяжкай прамысловасьці, разгортваньня вырабу сродкаў вытворчасьці вядуць да памылковых вываду. У тэзісах мы маем неабходную ўвязку карэнных палітычных задач з задачамі шпаркага палепшаньня дабрабыту рабочых і сялянскіх мас.

У прыведзеным мною вышэй адрыўку з рэзалюцыі, характарызуючы асноўную палітычную задачу другой пяцігодкі, гаворыцца таксама аб тым, што перад намі стаіць задача **перамаганьня перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей.** У зьвязку з гэтым прыходзіцца суспракацца аналь што не з такога роду пытаньнем: як іменна будзе абстаяць справа з перажыткамі капіталізму ў сьвядомасьці людзей на 1 студзеня 1938 году? **(Сьмех).**

Але ясна, што і ў гэтых адносінах схематызм і схаластычны разважаньні толькі шкодзяць справе. Між тым досыць спыніцца на карэнным пытаньні з гэтай галіны, на пытаньні аб проціглегласьці паміж разумовай і фізычнай працай, каб зразумець сапраўдную ўстаноўку тэзісаў.

У тэзісах, як вядома, нічога не гаворыцца аб зьнішчэньні ў другой пяцігодцы проціглегласьці паміж разумовай і фізычнай працай. Гэта праблема ўпаўне сьвядома, ня гледзячы на тое, што ў друку ўжо мяцецца спробы ў зьвязку з другой пяцігодкай, ставіць гэтае пытаньне. ЦК прыняў пастаноўку гэтага пытаньня ў тэзісах перадчасовай, немэтазгодным, таму што зьнішчэньне проціглегласьці паміж разумовай і фізычнай працай—справа значна больш працяглая, справа не аднэй і ня двух пяцігодак.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ўжо зрабіла нямала для таго, каб нацаць над рыў гэтай проціглегласьці. Усесагульная пісьменнасьць — адно з асноўных мерапрыемстваў у гэтай адносіне. Даступнасьць адукацыі ня толькі нижэйшай, але і вышэйшай кожнаму рабочаму і кожнаму працоўнему вёскі і выключна шпаркі рост тэхнічных і іншых навукова - кваліфікаваных кадраў у нашай краіне гаворыць аб тым, што мы ствараем матар'яльныя і культурныя прадпасылкі для барацьбы за зьнішчэньне проціглегласьці паміж разумовай і фізычнай працай. Але стаўіць задачу зьнішчэньня проціглегласьці паміж разумовай і фізычнай працай ужо ў другой пяцігодцы мы лічым заўчасным, не адказваючым аб'ектыўным прадпасылкам.

З другога боку, ажыцьцяўленьне такіх задач, як поўная ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул, а таксама далейшы і больш шпаркі ўздым дабрабыту працоўных, ня можа ня быць зьвязаным з задачай перамаганьня перажыткаў капіталізму ня толькі ў эканоміцы, але і ў сьвядомасьці людзей. Зразумела гэтыя перажыткі далёка яшчэ ня будуць ліквідаваны на працягу другой пяцігодкі. Аднак, у другой пяцігодцы барацьба за перамаганьне перажыткаў капіталізму ня толькі ў эканоміцы, але і ў сьвядомасьці людзей павінна быць разгорнута на ўсім фронце ў адпаведнасьці з асноўнымі палітычнымі задачамі партыі.

І, нарэшце, аб нашай партыі і барацьбе з апартунізмам.

Наша партыя, партыя рабочай клясы, вядзе працоўных СССР ад адной перамогі да другой. Наша партыя расьце з кожным годам колькасна і па сваіх сувязях ня толькі з рабочай клясай, але і з працоўнымі масамі вёскі; наша партыя расьце па вабыцьці ёю вопыту сацыялістычнага будаўніцтва і рэвалюцыйна - пралетарскай барацьбы ў цэлым, наша партыя ідэйна расьце і загартоўваецца ў барацьбе з усімі і ўсякімі антыленінскімі скажэньнямі і ўхіламі, за генэральную ленінскую лінію. Усё гэта—важнейшыя прадпасылкі перамогі кіраўніцтва справай пабудовы сацыялізму.

У пэрыяд другой пяцігодкі, у пэрыяд канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў наогул перад партыяй будуць стаяць складнейшыя задачы барацьбы за правядзеньне ленінскай лініі, за выкарэньваньне і належны адпор апартуністычным ваганьням усякага роду.

Ліквідацыя капіталістычных элементаў зьвязана з абвастрэньнем клясавай барацьбы на радзе вытворчасьці. Буржуазныя ўплывы прасякаюць і будуць яшчэ прасякаць ня толькі ў калгасы, але і на фабрыкі і заводы. Клясавы вораг мае сваіх агентаў і яшчэ доўга будзе іх мець на самых рознастайных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва і ў самой партыі. Той факт, што ў нас няма беспрацоўя, азначае ліквідацыю беспрацоўя для рабочых, але ён таксама азначае, што клясава - варожыя нам элементы пралазяць на нашы прадпрыемствы, у нашы ўстановы, што яны будуць рабіць усё новыя спробы падрываць бальшавіцкую работу сваімі контрэрэвалюцыйнымі вылазкамі, шкодніцтвам, кулацкім разлажэньнем асобных груп калгасьнікаў і інш.

Узмацненьне і рост дзяржаўнага апарату як у сувязі з ростам сацыялістычнай індустрыі, так і асабліва ў сувязі са шпаркім павялічэньнем сасцыялістычных форм у вёсцы вядзе ня толькі да паскоранага абнаўленьня нашых органаў новымі, адданымі справе сацыялізму элементамі працоўных, але і да вядомага новага прытоку ў гэтыя органы буржуазных, уключаючы і адкрыта - варожых элементаў.

У справу будаўніц

Фінпаход

У ТРЭЦІМ ЭТАПЕ

цалкам ліквідаваць запазычанасьць. Выканаць фінплян да 15 сакавіка

Барысаўскія крамы ЦРК высоўваюць сустрэчныя пляны

БАРЫСАЎ. (Белта). Дырэктывы партыі і ўраду аб мабілізацыі сродкаў, работнікі крамы № 21 праводзяць у жыцьцё, паказваючы ўзор бальшавіцкай барацьбы за справу мабілізацыі сродкаў. Плян тавараабароту за першыя дзьве дэкады студзеня крама № 21 выканала на 102 проц., па паднакапленьні на 162 пр. Работнікі крамы высунулі сустрэчную лічбу на паднакапленьні, выклікалі на сацспаборніцтва крамы №№ 23, 40 і 6, і ўзялі на буксір адстаючую краму № 20.

Крама ЦРК № 40 выканала плян па тавараазвароце на 144,2 проц. У адказ на выклік крамы № 21, работнікі крамы № 40 высунулі сустрэчны плян і абавязаліся замест 4000 р. па пляне даць 8000 руб. паднакапленьня.

Па краме № 6, плян па тавараазвароце выкананы на 109,1 проц., па паднакапленьні—на 149,7 проц. Крама скараціла накладныя выдаткі звыш чым на 1000 руб. у год. У краме чыстата і парадак, чарці амаль зьліквідаваны. Абгаварыўшы квартальны плян па паднакапленьні супрацоўнікі крамы № 6 высунулі сустрэчную лічбу ў 5400 руб., замест намечаных 2500 руб. і выклікалі на сацспаборніцтва тры іншыя крамы ЦРК. Такіх-жа посьпехаў дасягнулі крамы № 48 ЦРК і № 1 Белгандлю.

За сапраўдную бальшавіцкую работу ў справе мабілізацыі сродкаў, выкананьня гандль-фінпляну загалчыкі і паасобныя работнікі пералічаных крам саюзам працаўнікоў Дзяржгандлю і каапэрацыі прэм'яваны.

Магілеўскі штаб фінпаходу павінен зьвярнуць увагу на Вэндраскі сельсавет

Вэндраскі сельсавет, Магілеўскага раёну, раней паказваў, што па вазьцы «3-га рашаючага» праведзе на падпіска сярод калгасьнікаў на 19.095 руб. Зараз ён дае суму 16013 руб. Папраўдная сума падпіскі была сьвядома перавялічана.

Афарміленьне падпіскі па калгасах у вельмі дробным становішчы: да гэтага часу ўнесена толькі 29,2 проц. Гэта ў той час, калі калгасьнікі павінны былі ўнесьці грошы па падпісцы поўнасьцю да 1 студзеня.

Рад калгасаў (імя Калініна, «Сталінскі прызыў», імя Варашылава, імя Сталіна, «Пралетары») правялі рэалізацыю пазыкі толькі на паперы.

Сельсавет і сельская каса ашчадкасьці на працягу 6 месяцаў ня здолелі аформіць падпіску і правялі ў справе рэалізацыі пазыкі яўны апартунізм.

Да гэтага часу каса ашчаднасьці не правяла замацаваньня і раздачу талёнаў да аблігацый і з прычыны гэтага падпісчыкі да тыражу засталіся не забясьпечанымі аблігацыямі.

Раённая каса ашчаднасьці павінна ўлічыць гэты прарыў, і наладзіць работу Вэндраскай касы.

Вэндраскі штаб фінансавага паходу абавязан шырэй разгарнуць работу, каб забясьпечыць удзел шырокіх мас калгасьнікаў у фінпаходзе.

М. Р.

„Прафінтэрн" пераможна вядзе фінпаход

ВІЦЕБСК. (Белта). На аснове высокай мабілізацыі рабочых і разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва швэйная фабрыка «Прафінтэрн» дамаглася значных перамог на фінансавым фронце. Усе рабочыя фабрыкі ахоплены пазыкай «3-ці рашаючы» і калектыўным страхаваньнем. Плян на ўкладах у ашчаджасу ў суме 8.400 руб. павялічаны камісіяй садзейнічаньня фабрыкі да 10.000 руб. і на сёньняшні дзень перавыкананы да 20.500 руб., т. зн. на 100 проц. заданьня.

Лышчыні ўдарнікамі фінансавага фронту па фабрыцы «Прафінтэрн» зьяўляецца тт. Коган, Іофэ, Баярэр, Гофштэйн.

Прывітаньне ЦК КП(б)Б

Урачыстае паседжаньне прафэсыйных арганізацый, Наркампрацы, Галоўсацстраху і органаў аховы здароўя, шырокага рабочага актыву горада Менску, ў дзень дзесяцігодзьдзя сацстраху — шле палкае пралетарскае прывітаньне кіраўніку камуністычнай партыі і пралетарыяту БССР—ЦК КП(б)Б.

Вялізарныя посьпехі ўсёй народнай гаспадаркі СССР і БССР, дзякуючы перамозе ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА, далі сацстраху магчымасьць ператварыцца ў сапраўднага змагара за выкананьне прамфінпляну, за ўзьняцьце вытворчасьці працы і паляпшаньне сацыяльна - бытавых умоў рабочае клясы.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты ў выніку выпрабаванага кіраўніцтва ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным і ЦК КП(б)Б, і барацьбы з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, правільным правядзеньнем Ленінскай нацпалітыкі.

Заяваем, што ў далейшым будзем змагацца на падставе 6 гістарычных умоў тав. Сталіна за выкананьне 5-цігодкі за 4 гады, за паляпшаньне сацыяльна - бытавых умоў рабочых, за другую пяцігодку.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!
Няхай жыве ЦК УсеКП(б) і яе стальны правадыр тав. Сталін!
Няхай жыве сусьветны КАСТРЫЧНІК!

ПРЭЗЫДЫУМ.

Паказваем перавагі гаспадарча-разьліковых

НЯМА АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ, ЛІШНІЙ ТРАТЫ МАТАР'ЯЛАЎ ЕСЬЦЬ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯЎ, МАБІЛІЗАЦЫЯ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ.

Сёньня на старонках нашай газэты расказвае аб поспыце сваёй работы брыгада Бабруйскага хлебазаводу, якая перайшла на гаспадарчы разьлік. Расказваюць і гаспадарча-разьліковыя брыгады заводу «Бальшавік». Аб чым гаворыць вопыт работы гэтых брыгад?

На хлебазаводзе ў брыгадзе па вырабу сухароў ліквідавана абязьлічка і ўраўнілаўка. Там увезена вымена-сустрэчнае плянаваньне, якое дае павышэньне дзеннага выпуску прадукцыі да 23 проц.

Гаспадарча-разьліковыя брыгады заводу «Бальшавік», правільна арганізаваўшы сваю работу, даюць значны эканамічны эфэкт. Брыгада стругалей першага хромавага цэху дала эканомію за кастрычнік у 144 р. 54 кап. Брыгада кацельнага цэху за той-жа месяц дала эканомію 1.176 р. 40 кап. Набіўшчыкі хромавага цэху за верасень далі эканоміі на 1.875 р.

Гаспадарчы разьлік—вышэйшая форма сацспаборніцтва і ўдарніцтва, заваявала сваё пачэснае месца на чырвонаштандарным «Бальшавіку», на радзе іншых перадавых фабрыкаў і заводаў.

Але ня ўсе гаспадарча-разьліковыя брыгады маюць дасягненьні. Сёньня мы падаем факты аб тым, што брыгады змазчыкаў маюць перавыдатак матар'ялу.

Таму вельмі каштоўным зьяўляецца рэалізацыя вопыту «Бальшавіка», які арганізаваў узаемную самаправерку работы гаспадарча-разьліковых брыгад. На «Бальшавіку» праводзяцца таксама нарады гаспадарча-разьліковых брыгад. Гэта адна з лепшых форм праверкі таго, як гаспадарча-разьліковыя брыгады правяраюць работу ўнутры сваёй брыгады. Гэты вопыт трэба пераняць на другія прадпрыемствы.

Абмен вопытам работы гаспадарча-разьліковых брыгад, папулярызацыя лепшых прыкладаў мае зялёзнае значэньне ў галіне разгортваньня гэтай новай, вышэйшай формы сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны штодзённым кіраўніцтвам работай гаспадарча-разьліковых брыгад забясьпечыць іх перадавую ролю на прадпрыемстве і дапамагчы, на вопыце лепшых гаспадарча-разьліковых брыгад, зьнішчыць недахопы ў практыцы работы адстаючых.

Забясьпечыць перадавую ролю брыгад

Гаспадарчы разьлік, як вышэйшая форма сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на чырвонаштандарным заводзе «Бальшавік» заваяваў сваё месца. Дзякуючы таму, што гаспадарча-разьліковыя брыгады змагла паставіць сваю работу на належную вышыню, было забясьпечана датэрміновае выкананьне прамфінпляну 3 рашаючага году пяцігодкі. Па колькасных паказьніках на 112,13 проц., а па кошту—на 100,02 проц. Таксама выкананы прамфінплян па ўсіх іншых паказьніках.

Брыгады пачалі пераводзіцца на гаспадарчы разьлік з лістпада 1931 г. На сёньняшні дзень на заводзе налічваецца 21 гаспадарча-разьліковая брыгада.

Так, напрыклад, гаспадарча-разьліковая брыгада строгалей 1 хромавага цэху за кастрычнік дала эканоміі на 144 руб. 54 кап., за лістапад 59 р. 18 к. Намазчыкі 2 хромавага цэху з моманту пераходу яго на гаспадарчы разьлік за верасень далі эканоміі 129 р. 60 к., за кастрычнік 381 р. 88 к., за лістапад 206 р. Набіўшчыкі 2 хромава цэху за верасень далі эканоміі 1.875 р., за кастрычнік 4.029 р. 92 к.

Гаспадарча-разьліковая брыгада кацельнай № 1 за верасень дала эканоміі 2.513 р. 17 к., за кастрычнік 1.176 р. 40 к., за лістапад 1:125 р. 40 к. Кацельная брыгада № 2 за верасень дала эканоміі 1.397 р. 91 к., за кастрычнік 743 р., за лістапад 525 р. Глейтаўшчыкі 1 хромавага цэху за кастрычнік маюць эканоміі 87 р. 78 к., за лістапад 149 р. 16 к. Варшчыкі жалацінпага цэху за кастрычнік маюць эканоміі 553 р. 34 к. і г. д.

Эканамічны эфэкт работы гаспадарча-разьліковых брыгад ідзе за кошт эканомнага скарыстаньня матар'ялаў, лепшай арганізацыі працы, правільнай расстаноўкі рабочай сілы, пасьлядоўнага футажу і г. д.

Галоўнае, што забясьпечвае перамогу гаспадарча-разьліковым брыгадам, гэта прэм'яваньне, якое брыгады атрымліваюць з агульнай сумы эканоміі і штодзённае кіраўніцтва з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Але побач з дасягненьнямі мы маем і рад недахопаў у рабоце гаспадарча-разьліковых брыгад. Мы яшчэ маем такія брыгады, якія ня толькі ня маюць эфэктыўнасьці ў сваёй рабоце, але маюць перавыдатак матар'ялаў. Брыгада намазчыкаў 1 хромава цэху мае перавыдатак у верасьні на 559 р. 90 к., у лістападзе—343 р. 35 к. Брыгада рамшчыкаў 1 хромавага цэху ў верасьні мае перавыдатак на 11.655 р., у кастрычніку 8.223 р. 36 к., а ў лістападзе—15.448 р: 82 к.

У той час, калі гаспадарча-разьліковыя брыгады рамшчыкаў і намазчыкаў 2 хромава цэху маюць эканомію, брыгада зольчыкаў жалацінпага цэху мае перавыдатак у кастрычніку на 682 р. 50 к.

Вышэйпаданыя факты яскрава пацьвярджаюць, што ня ўсе гаспадарча разьліковыя брыгады паставілі сваю работу на належную вышыню. Зараз, калі на заводзе вядзецца далейшая ўдарная работа па пераводзе яшчэ радзу брыгад на гаспадарчы разьлік, мы павінны ўлічыць усе недахопы, якія маюцца ў рабоце гаспадарча-разьліковых. Часьцей склікаць нарады гаспадарча-разьліковых брыгад па абмену вопытам работы, папулярызаваць лепшыя гаспадарча-разьліковыя брыгады, забясьпечыць штодзённае кіраўніцтва імі. Гэта забясьпечыць перадавую ролю гаспадарча-разьліковых брыгад на вытворчасьці.

Брыгада «С. Б.»
Шамэс І., Мінкін З.

Што даў нам сацыялістычны гаспадарчы разьлік

БАБРУЙСК. Наша гаспадарча-разьліковая брыгада хлебазаводу па выпечцы сухароў складаецца з 8 асоб. З агульнай колькасьці ўдзельнікаў брыгады—6 чалавек ударнікі. Брыгада мае ў сваім складзе 4 камсамольцы.

На гаспадарчы разьлік брыгада перайшла з 1 студзеня гэтага году і за невялікі час сваёй работы мае значныя дасягненьні, якія цалкам пацьвярджаюць, што гаспадарчы разьлік зьяўляецца магутнейшым сродкам узьняцьця прадукцыйнасьці працы і палепшаньня вытворчасьці.

Кожны з удзельнікаў нашай брыгады ведае сваю дзённую выпрацоўку.

У рабоце цалкам ліквідавана абязьлічка і ўраўнілаўка, наладжана зьмена-сустрэчнае плянаваньне. У асобныя дні сустрэчна-зьменныя пляны перавышаюць лічбы, даныя адміністрацыяй, на 23 проц.

З 1 студзеня брыгада перайшла цалкам на прагрэсыўна-прэміяльную аплату. У выніку значна падвысілася прадукцыйнасьць працы, цалкам зьнішчаны прагулы і спазьненьні.

Брыгада прымае актыўны ўдзел у грамадзкай працы. **Рэгулярна выходзіць брыгадная штодзённа.** Два брыгадзіры—члены цахкому.

У выніку пераходу брыгады на сацыялістычны гаспадарчы разьлік брыгада штодзённа перавыконвае свой прамфінплян, цалкам ліквідавала брак, дасягнула значнай эканоміі ў выдаткаваньні мукі. Палепшана якасьць прадукцыі.

Побач з гэтым, на сёньняшні дзень у рабоце ёсьць і недахопы.

Расцэнкі за эвышпляновую выпрацоўку брыгадзе яшчэ дакладна невядомы. Адміністрацыя не патурбавалася іх давесьці да брыгады, няма таксама поўнага абсталяваньня. Печка папрабуе капітальнага рамонту. Гэта не дае магчымасьць брыгадзе далей разгортваць тэмпы ў рабоце.

У адзнаку ленінскіх дзён і падрыхтоўкі да XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі брыгада падвысіла на 20 проц. нормы выпрацоўкі, абавязаўшыся ўцягнуць усю брыгаду ў рады ўдарнікаў і перадаць лепшых ударнікаў камсамольцаў у рады партыі.

Сацыялістычная гаспадарча-разьліковая брыгада аддзяленьня Бабруйскага хлебазаводу:

Грэўскі, Кітаін, Яўна, Рудзявіцкая, Левіна, Гуніна, Багдалеўская, Патаповіч.

Падлічваем эфэкт работы

Бюро парткалектыву і заводзкі камітэт гарбарні «Бальшавік» у сваіх пастановах ад 26 і 27 студзеня пастанавілі правесьці масавую праверку працы гаспадарча - разьліковых брыгад заводу. Праверыць як кожная брыгада змагаецца за выкананьне гаспадарча - разьліковага дагавору, як яны ажыцьцяўляюць лёзунг перадавой ролі на вытворчасьці.

21 гаспадарча - разьліковая брыгада, якія маюцца на сёньняшні дзень, ахапляюць 36,8 проц. усіх ударнікаў заводу. У лік гаспадарча - разьліковых брыгад уваходзяць амаль усе перадавыя працэсы вытворчасьці: строгалі, гляйтоўшчыкі, набіўшчыкі і інш. Гэта стварыць перад імі яшчэ большую адказнасьць у справе забясьпячэньня іх перадавой ролі на вытворчасьці.

У бліжэйшы час адбудзецца агульна-заводзкі зьлёт ударнікаў гаспадарча- разьліковых брыгад з удзелам усіх ударнікаў заводу. Да гэтага зьлёту кожная гаспадарча - разьліковая брыгада павінна праверыць усю сваю працу з тым, каб прысьці да яго падрыхтаваным, ведаючы ўсе дасягненьні і недахопы.

Праверка працы гаспадарча - разьліковых **брыгад** будзе праводзіцца шляхам **узаемнай** самаправеркі аднэй брыгады другой.

Праверка павінна ўзьняць актыўнасьць усіх ударнікаў, накіроўваючы яе на далейшы перавод брыгад на гаспадарчы разьлік. За час праверкі мы павінны дабіцца ўмацаваньня перавedзеных брыгад на гаспадарчы разьлік, максымальнага эканамічнага эфэкту ад пераводу, накіроўваючы ўссю ўвагу на ўсямернае палепшаньне якасьці прадукцыі.

М. Ш.

Барацьба за лён

Арганізацыяй ударнага канвэеру

паміж апрацоўкай і загатоўкай дабіцца пераломі ў лёназагатоўках

Люты--рашаючы месяц барацьбы за лён

Даныя ходу загатовак лёкультур гавораць аб недапушчальным інтэраваньні раду раёнаў разгортваньня бальшавіцкай барацьбы за лён. Агульны плян лёназагатовак па БССР, на 1 лютага, выкананы толькі на 52,9 проц. Апошняя пяцідзёнка дала надзвычайна нізкі прырост—усяго на 1,1 проц. Па-ранейшаму адстае аднаасобны сэктар. У той час, як саўгасы выканалі плян на 113 проц., калгасы—78,8 проц.—аднаасобны сэктар выканаў плян толькі на 36,4 проц.

У чым прычына павольнасьці тэмпаў лёназагатовак? Прычына—у адсутнасьці арганізацыйна-масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас аднаасобнікаў, адсутнасьці арганізацыі першапачатковай апрацоўкі, у адсутнасьці рашучага націску на кулака, які ўпарта супрацьўляецца ў выкананьні цьвёрдых заданьняў.

Агітуючы супроць лёназагатовак, за зацяжку першапачатковай апрацоўкі, кулак у той-жа час, карыстаючыся паслабленьнем з боку мясцовых органаў, упарта ня зьконвае цьвёрдых заданьняў.

ЦК КП(б)Б у сваёй апошняй пастанове, папяраджаючы адсталыя раёны аб недапушчальнасьці інтэраваньні барацьбы за лён, паставіў самую задачу перад усімі партарганізацыямі—дамагчыся рашучага пералому з тым, каб да 1 сакавіка цалкам выканаць плян лёназагатовак. Гэта задача ды рэктыва партыі павінна быць рэалізавана. Люты зьяўляецца рашаючым месяцам лёназагатовак, трэба прадпрыняць усе меры, каб ні ў якім разе не дапусьціць зацяжкі лёназагатовак.

Разгортваючы бальшавіцкую барацьбу за лён, партарганізацыі павінны дамагчыся рашучага пералому. Асноўны ўпор павінен быць зроблены на першапачатковую апрацоўку. Лыэрэктывы НКЗ аб арганізацыі першапачатковай апрацоўкі павінны быць рэалізаваны. Арганізуючы загатоўкі па лініі аднаасобнага сэктару праз масавую работу сярод бядняцка-сераднякіх мас, у той-жа час неабходна з усёй жорсткасьцю націскаць на кулака, прымусіць яго неадкладна здаць лён.

Дамагчыся поўнай перамогі на фронце лёназагатовак у лютым—абавязак кожнага раёну, партарганізацыі, сельпарткомаў, сельсаветаў, кожнага саўгасу, МТС, калгасу.

Адсутнасьць вучоту дэзарганізуе лёназагатоўкі

Магілеў. Ня гледзячы на папярэджаньні дырэктыўных органаў пра не абходнасьць дабіцца рашучага пералому ў галіне лёназагатовак Магілеўшчына і да апошняга часу цягнецца ў хвасьце. На 1 лютага плян загатовак па валакне ледзь выкананы на 52,2 проц.; калгасны сэктар выканаў плян на 78,7 проц.; аднаасобны—40,5 проц.

Лёназагатоўкі да апошняга часу праходзяць самацёкам, не вядзецца рашучая барацьба з кулаком і яго агентурай — апартуністамі. Аб гэтым яскрава сьведчыць факт, што Райспажыўсаюз адмяніў вучот спагнаньня лёну па цьвёрдых заданьнях, а Райзаг прымірэнча аднесься да гэтага абураючага факту. З пачатку загатоўчай кампаніі Райспажыўсаюз ня ўключае ў зводкі паасобную графу для паступленьня лёну па цьвёрдых заданьнях. Наогул трэба адзначыць, што вучот лёназагатовак пастаўлены вельмі дрэнна. Так, напрыклад, на 10 студзеня г. г. у зводцы было паказана, што Грабянеўскі сельсавет выканаў плян лёназагатовак на 171 проц., а на 20 студзеня паказана ўжо 32 пр.

У выніку паслабленьня тэмпаў лёна загатовак, з боку раённых загатоўчых арганізацый, рад сельсаветаў і калгасаў спынілі барацьбу за лён. Вішоўскі сельсавет, які ішоў па загатоўках у першых радах (па калгасах 74 проц., аднаасобным сэктары 61 проц.), ва апошнюю пяцідзёнку загатоўкі ўзрасьлі толькі на 1,1 проц. Ганебна здалі тэмпы і сталі ў рад адсталых Мастоцкі, Машанацкі і Цішоўскі сельсаветы.

Барацьбу з дэмабілізацыйнымі настроямі трэба разгарнуць в самых ніізоў, з вёскі і калгасу, уцягваючы ў барацьбу за лён шырокія масы калгасьнікаў - ударнікаў, і аднаасобнікаў —беднякоў і сераднякоў. У гэтых адносінах заслугоўвае вопыт работы Вэндарскага і Сялецкага сельсаветаў, дзе ў зьвязку з пастановай РК КП(б)Б, ужо пачата шырокая мабілізацыя калгасьнікаў і аднаасобнікаў вакол барацьбы за выкананьне гадавога пляну. Гэта пытаньне абгаворвалася на пленумах і прэзыдыумах сельсавету, на нарадзе старшынь калгасаў. На сёньняшні дзень ёсьць ужо станоўчыя вынікі. Аднаасобны сэктар, Сялецкага сельсавету, высунуў сустрэчны плян і выканаў гадавое заданьне на 187 проц., па Вэндарскім сельсавеце — на 100,6 проц. Зараз усе сілы ў гэтых сельсаветах кінуты на аканчэньне апрацоўкі лёну па калгасах.

Па прыкладзе перадавікоў необход на мабілізаваць калгасныя масы і аднаасобны сэктар на барацьбу за выкананьне пляну, трэба накінуць на кулака і прымусіць яго выканаць цьвёрдае заданьне. Магілеўшчына па віна ў бліжэйшы час дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну лёназагатовак.

Д. Алін.

Разрыў паміж апрацоўкай і загатоўкаю не ліквідаваны

Шклоў. Да апошняга часу лёназагатоўкі не набылі ў раёне сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў. На 1 лютага агульна - раённы плян па лёнавалакне выкананы толькі на 43,6 проц. Калгасы выканалі плян на 48,2 проц., аднаасобны сэктар — 39,2 проц. Такое ганебнае адставаньне тлумачыцца тым, што з боку нізавых арганізацый не надана належнай увагі апрацоўцы і загатоўцы лёну, ня ўжыты захады па ліквідацыі разрыву паміж апрацоўкай і загатоўкай.

Рад сельсаветаў злачынна адстаюць у выкананьні пляну лёназагатовак. У такіх лёнаводных сельсаветах, як Нова - Брашчынскі, Чарнянскі і Еганаўскі лёназагатоўкі амаль не разгарнуліся.

Фарсаваньне тэмпаў загатовак упраецца ў разгортваньне апрацоўкі лёну непасрэдна ў калгасах і вёсках.

У Нова-Брашчынскім, Талкачоўскім, Чарнянскім і іншых сельсаветах усё яшчэ маюць месца памылковыя надзеі, што лён будзе перапрацаваны на лёназаводзе і што ня трэба праводзіць ручную апрацоўку лёну. З боку сельсаветаў не даны рашучы адпор гэтым беспадстаўным разважаньням.

Загатоўка трасты і лёнасалому так сама дрэнна арганізавана і праходзіць марудна. Лёназавод забясьпечан сыравінай ня больш як на 10 дзён. Калі ў бліжэйшыя дні ня будзе дасягнуты пералом, лёназавод можа стаць.

Трэба дамагчыся рашучага пералому на фронце лёназагатовак. Арганізаваць цяй буксірных брыгад, узаемадапамогі, шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, узмацненьнем прагрэсыўна - прэм'яльнай вытворчасьці, поўным спагнаньнем лёнаналакна па цьвёрдых заданьнях—у бліжэйшы час Шклоўшчына павінна выканаць плян лёназагатовак.

М. Альхоўскі.

ВЫЙДУЦЬ КРЫЦЬЦЬ СЬНЕГ

Фурман блудзіць

Рабочыпала змрочыць. Сіняватая ад сьнегу чарната акутала нярухомыя вагоны, цэлыя саставы. Прабягалі цягнікі, расьсякалі чорнае паветранае мясіва і, здавалася, напружвалі ўсе свае жалезныя сілы толькі для гэтага.

Малажавы і рослы фурман спрытным прыбег у памяшканьне аб'яднанага мясцкому. Тыя, што чакалі, заварушыліся.

— Дарогу на Сеньніцу ведаеш?

— Канешне.

Сказанае было гэтак пераканаўча, што распытвацца пра дарогу было зусім лішнім. Селі. Па галалёдай дарозе нацягнута шарахалі палазы. І дарога была да таго вяаручнай, шурпатай, цяжкай, што конь станавіўся і аддыхваўся.

Тупік. З аднаго боку высокія, рабыя, залепленыя празёю і сьнегам, шчакеты. З другога—чыгуначныя рэйкі, што дзьюма роўналежнымі стужкамі забягаюць за домік, які крыху далей. Ехаць няма куды. Фурман злазіць з санак і лаецца. Мы дакараем яго за тое, што залішне пераканаў нас у сваёй «арыентацыі». А гэта яго прымусіла апраўдвацца:

— Ня быў я тут год каля дзесяці. Раней была простая дарога, што стрэліць. А зараз будынкі вось. Вялікія і густыя будынкі. Дзе дарога—не зразумееш

Дарогу давялося шукаць, распытваць у праходжаўшых і ехаць за тымі, якія сваім месцам жыхарства назвалі калгас «Чырвоны спэцыяліст».

Першым ад дарогі стаяла памяшканьне праўленьня калгасу. Мелася быць паседжаньне, на якое сабралася каля двох дзесяткаў старых і маладых. У накураным пакойчыку душна. Да пісаньня пратаколу падрыхтоўваўся маўклівы бухгальтар, з акуратна расчэсанымі на два баакі валасамі. У старшыні калгасу—такія-ж вусы, на два баакі, з двума закруткамі, ахайна падпятымі ўверх.

У калгасе ня скончана малацьба. Людзі гавораць пра падзеньне працоўнай дысцыпліны, пра рабочую сілу. Уся соль—у ёй. Рабочая сіла ёсьць, але як следна не скарыстоўваецца.

Гавораць пра трактарыста, які таксама некалькі замарудзіў малацьбу.

— У нас трактар трактарыстам кіруе, а не трактарыст трактарам. Захацеў трактар пакурыць, дык і трактарыст курыць.

Падымаецца шумок. Па куткох перашэптваюцца. З лаўкі падымаецца са скаргай:

— Не пайду працаваць. Працаваць за 25 капеек?..

Ззаду падказваюць:

— Гэта Антон. На кароўніку працуе. Дзень працуе, два п'янствуе.

Антон хіба гаворыць пра непаладкі. Не для таго, каб паказаць на іх, а каб ядавіта дапякнуць праўленьне. Грукае па стале кулаком і кланяецца, што прападзе лепш, а кароў галоднымі пакіне.

Пачынаецца перакідваньне словамі. Кардынальнай тэмы няма; наперабой гавораць аб усім: аб зарплаце, аб пра гульшчыках, аб тым колькі і калі, і як, і каму далі прадуктаў. І заўжды амаль на ўсіх сходах дзелавыя пытаньні ператвараліся ў шумныя спрэчкі аб «розных» справах.

— У школу не пайду, старая ўжо.

— А мне малака, дык і ня далі на дзіцё.

— У газэтку-б усё гэта.

Муца, былы старшыня калгасу, першым спрабуе прыцішыць пачатыя спрэчкі, пераключыць іх на абгаварэньне малацьбы.

— Ня больш, чым за тры дні малаць бу скончым. Для гэтага трэба арганізаваць пагалоўны выхад на работу.

І зноў арганізацыя рабочай сілы і выхад на работу робіцца эснаўнымі пытаньнямі паседжаньня.

— Калі ня скончым за тры дні, дык усяму жыту хана (канец) будзе.

— Паставіць тры прывады. Яны-ж у нас ёсьць.

Зноў падымаецца Антон і грукае па стале:

— На словах вы добра працуеце, а на фрактыцы?

І хіба, і ядавіта сочыць за тым, што скажуць яму ў адказ.

Бястурботны прадстаўнік

Чыгуначнікі расказалі пасяджэньню пра становішча на чыгунцы. Пра небясьпеку ад завеяў. Ад тых завеяў, што дзесяткі гружаных вагонаў затрымліваюць на шляхох. Аб тых завеях, якія жорсткай рукою прыпыняюць рух цягнікоў і, калючай бельмо паслаўшыся на рэйках, моцна ашчапераваюць іх. Расказалі пра першую завею, з якой ня здолелі падужацца ні Менскі чыгуначны вузел, ні калгас «Чырвоны спэцыяліст». Пра завею, якая бушавала на чыгунцы, за вокнамі прысадзістых хат. Соромна: ні адзін след ад калгасу да чыгункі па намеценым сьнегу пракладзены ня быў.

І скрозь гэты пылок сьнегавы зноў гучыць голас Антона:

— Не пайду за 25 капеек працаваць.

— Пойдзем — узлавана адказваюць яму.

— Браткі—радуецца старшыня—доб ра вельмі, што вы дапамагчы нам прыехалі.

І ён расказаў гісторыю аб тым, як заключаўся ранейшы дагавор на рабочую сілу па сьнегаачыстцы.

У гэтым-жа самым пакойчыку. Прад стаўнік ад акалодку з ахвотаю грызе чырвонае яблыка і шарасьцеў бялютка паперкай.

— Дык як, колькі даеш рабочых?

— Няма, браток, для сябе не хапае.

— А ўсяго колькі працаздольных?

— Каля 250.

Прадстаўнік ад акалодку ўклаў аловак у пальцы старшыні і пацягнуў яго руку да паперы.

— На 80 чалавек.

Старшыня моршчыўся, крывіўся. Але падпісаў дакумант аб 80 рабочых, аб тарыфна-падзённай плаце за дзень у 2 р. 70 кап., аб харчаваньні, аб бясьпечаньні інвэнтаром, рукавіцамі. Старшыня падпісаў сацыялістычны дагавор з чыгункай. Гэта асаблівай цяжкасьці для яго не каштавала. Другі ўзмах рукі таксама было лёгка зрабіць: пакласьці дагавор у папку і ні слова не сказаць аб ім калгасьнікам.

Прадстаўнік акалодку таксама лічыў сваю справу закончанай. Пасьля, лежачы ў цёплым ложку і слухаючы сардзітае скавытаньне зімы, сьніў прыемнае:

Рэйкі. Замеценыя рэйкі. Занесеныя сьнегам вагоны прыпынены ў дарозе. Але паміж рэек кладуцца сьляды. Гэта сьляды калгасьнікаў з «Чырвонага спэцыяліста». Шыгаюць рыдлёўкі. У бок адлятае, ламаецца і крышыцца сьнег. І плаўна ідуць цягнікі і задорыста грукаюць вагоны.

Сьпіць дарожны майстра. Але канчаецца сон. За сьцяной сардзітае скавытаньне буры. Прыпыненыя цягнікі. І—ніводнага калгасьніка з «Чырвонага спэцыяліста». Вось вынік работы бяз мас.

Брыгада прымусіла праўленьне зрабіць дагавор рэальным, давесьці яго да калгасьнікаў.

Рэдзенькія аплёдысмэнты

У калгасе 4 пададдзяленьні. Тут іх завуць чамусьці «эканоміямі». Перад тым, як паехаць у самае большае аддзяленьне «Калядзічы», заходзім у праўленьне.

Там каля дзесятку калгасьнікаў. Загадчык малочнай фэрмы разьлічваецца з калгасьнікам за цялё, якое той аддае ў абагуленае стада.

— Гэта цялё тваё, уласнае?

— Не, каровіна—апраўдваецца калгасьнік, жартаўліва пазіраючы на загадчыка фэрмы.

Тут-жа бойкая зоатэхнічка вучыць як расцячаць гадоўлю прывезенага цяляці, як выхаваць з яго самую малочную, самую здаровую карову.

Ад штабу да аддзяленьня каля кілёматру. Ды самыя Калядзічы кілёматры на два. Тут галоўная сіла «Чырвонага спэцыяліста».

Прызначаны сход зьбіраўся марудна. Гаспадыня, у якой зьбіраўся сход, скардзілася:

— Сесьці няма дзе. Па ложках таўкуцца. Навалочкі ды падсьцілкі хоць кожны дзень мый.

Спачатку калектыўна чыталі аднадзённую газэту, выпушчаную брыгадай за гадзіну да сходу. Да пісаньня яе настаўніцу прыцягнулі. Тут-жа пры сутнічае былы старшыня калгасу Муца.

Дыктую:

«У ранейшым праўленьне спасылася на адсутнасьць рабочай сілы. Ад такіх разважаньняў яно павінна заразжа адмежавацца, асудзіўшы іх як апартуністычныя. Сілы ў калгасе маецца, але вось належнай арганізацыі працы ня было».

Муца палохаецца:

— Браточкі, за што вы ўжо пра апартунізм. Ну, ня было рабочай сілы. Ну, ня было арганізацыі працы.

А па дарозе, калі ехалі ў Калядзічы, ён расказаў:

— Тут кулакоў шмат. І падпявалаў іх шмат. Працуюць. Аднойчы ход праводзілі. Дык, павер, з кулакамі да мяне кінуліся:

— Ты—гаворыць—зарэзаў нас. Калі старшынёй будзеш, дык калгас разваліш.

І тады-ж, пасьля гэтых слоў, ззаду сходу пачуліся рэдзенькія аплёдысмэнты.

Сход шуміць

Даклад аб становішчы на чыгунцы, аб сьнегабарацьбе слухалі ўважліва. Частка калгасьнікаў расьселася на падлозе, на ложках. Частка заставалася ў першым (пярэднім) пакойчыку.

— Заходзьце ўсе ў гэты пакой—пра сілі іх.

— Нічога. Мы і тут пачуем—адказвала некалькі галасоў з пярэдняга пакою.

За словамі і ў словах дакладчыка дужай маладзецкай уставала вясна. Вяс на з машынамі, з нястачаю іх, вясна з угнаеньнем, з нястачаю яго. Уставалі і расьцілаліся каля 1000 га пахаці, шырокага лугу з дробнымі кусточкамі. Вясна павінна быць машыннай, угноенай. А тут-сьцюжа. І пружаны састаў з машынамі, угнаеньнем і інвэнтаром прыпыняецца далёка ад пралетарскага Менску.

Паказана неабходнасьць у кожную хвіліну быць гатовымі для выхаду на ачыстку шляхоў. Паказана поўная маг чымасьць па першым патрабаваньні высылаць з Калядзічы на чыгунку ня менш 39 рабочых і 5 падвод.

— Хай хлебныя рабочыя самі чысьцяць—пачыналіся выкрыкі з пярэдняга пакойчыку.—Я хлеба дзесяць пудзі каў на сям'ю атрымаў.

Адразу давялося ўспомніць прынцып: «хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае».

— Якраз уцэліў — нашэптваў мне старшыня калгасу, ведаючы аб тым, хто гаварыў пра «хлебных».

Але хваля пачыналася зноў. І з таго-ж самага пярэдняга пакою:

— Больш пяцёх чалавек на чыгунку ня выйдзе. Астатнія ня пойдуць.

Старшыня злавайся. Падымаўся з лаўкі і лічыў:

— У вашым аддзяленьні 84 працаздольных мужчыны, акрамя жанчын. На работах, ад якіх ніяк не адарвеш, каля 30 чалавек. А 40 чалавек па патрабаваньні на чыгунку выйдуць.

Сход маўчаньнем згаджаўся з даведзеным. Пад канец чуліся актыўныя падтрыманьні.

Толькі ў пярэднім пакойчыку зноў непакоіліся:

— Бач. Языка разьвязаць не даюць. На ўсё адказ знойдуць.

— А кулацкія языкі і вырваць ня пкодзіла-б.

Зноў з пярэдняга пакойчыку пярэчылі:

— На ліха яму. Такога няжэчнага прадстаўніка мы ня бачылі яшчэ. Ужо і языкі выразаць думае. З намі ўсё па ласкаваму гаворыць.

Пачыналі шумець.

— Паглядзець на суседні калгас. Там у мляне не хапае нафты. А хлопцы мелюць і гавораць: «Мялі—мялі: і мука і нафта будзе». А вы вунь па што пачынаеце.

У гэтага, што гаворыць, завостраны нос, рэдкая барадка, упалыя вочы. Ён партыец. Татарын. Перакінуты васяльмі пад

Прывітаньне прадстаўніка Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі

Таварышы! З глыбокага падполья Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ад імя рабочых і працоўнага сялянства Зах. Беларусі шле XIV зьезду КП(б)Б пал кае братэрскае прывітаньне (бурныя, доўгія воплескі).

Ваш зьезд праходзіць у момант выключна важнага гістарычнага значэньня, у момант, калі як ніколі выпукла ецца ровьпка помік СССР і капіталістычным сьветам. У СССР — будаўніцтва соцыялізму, непаможнае закапчэньне пяцігодкі за чатыры гады, завяршэньне фундаманту сацыялізму, калектывізацыя сельскай гаспадаркі і на аснове гэтага ліквідацыя кулацтва, як класы, ліквідацыя беспрацоўя, бесперапыннае палепшаньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных мас.

У капіталістычным сьвеце — глыбокі крызіс, які ахапіў усе капіталістычныя краіны, патрасаючы аснову капіталізму, асабліва моцна б'ючы па Германіі, Польшчы і некаторых іншых, рост унутраных супярэчнасьцяў, рост беспрацоўя, голаду і галечы, рост эксплёатацыі працоўных мас, поўная роспач.

З асаблівай увагай сачыць наша партыя і ўсе працоўныя масы Зах. Беларусі за вашым зьездам, за вялізарнай працай, што прароблена вамі на працягу нескалькіх год. Ваш зьезд можа з гонарам падсумаваць небывалы росквіт прамысловасьці БССР, рост пралетарыяту і яго дабрабыту, посьпехі калектывізацыі, вялізарныя посьпехі на фронце будаўніцтва культуры сацыялістычнай на зьмесьце і нацыянальнай па форме. Вашыя посьпехі сталі магчымы толькі дзякючы бязьлітасной барацьбе на два фронты, барацьбе з правым апартунізмам, з рэшткам трацкізму і «левымі» загібамі, дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, дзякуючы правільнай генэральнай лініі ЦК КП(б)Б, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і яго правадыра т. Сталіна.

Такі рост БССР, росквіт усёй нарэшце гаспадаркі і культуры магчымы толькі дзякуючы суцэльнай барацьбе пралетарыяту БССР з гераічным пралетарыятам усяго Савецкага Саюзу, пад правільным кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б).

Вашы перамогі даюць сілы і ўпэўненасьць, спрыяюць росту рэвалюцыйнага руху ва ўсёй Польшчы і асабліва на Зах. Беларусі.

Зусім у іншых умовах даводзіцца змагацца пралетарыяту і працоўным масам Зах. Беларусі і ўсёй Польшчы. Камуністычная партыя кіруе ўзрастаючым рэвалюцыйным рухам у нячуванна цяжкіх умовах, з глыбокага падполья, над якім панёсны разгул белага тэрару. Чым больш расьце рэвалюцыйны рух і нездавальненьне мас, тым больш фашызм, ды дапамозе ўсіх сацыял-фашыстоўскіх і нацыянал-фашыстоўскіх партый, пераходзяць з кожным днём да ўсё больш лютых мэтадаў белага тэрару, да масавых цьбоснц, фаагулу аховы і вастрогаў, карных экспедыцый, ужываючы ўсё больш мэтады грамадзянскай вайны.

Таварышы! Па Польшчы і Зах. Беларусі сусьветны крызыс капіталізму ударыў з асаблівай вастрынёю. Асноўныя галіны прамысловасьці цалкам замёрлі, або перажываюць глыбокі крызіс, які набывае формы катастрофы (металюргія, вугаль, тэкстыль і г. д.). Крызыс перарос у цяжкі фінансавы крызыс, што знайшло свай адбітак у банкрутстве буйных банкаў, у адпливе золата і валюты за граніцу, у звужэньні прадовага звароту і катастрафічным скарачэньні бюджэтных крыніц польскай дзяржавы. Крызыс з асаблівай сілай ударыў па вёсцы. У вёсцы панае голад. Зруйнаваны ўсе дробныя і сярэднія гаспадаркі. Звычайнасьць сялянства набыла вялізарныя разьмеры. Бязьмерны цяжар падаткаў, штрафаў, розных кар і г. д. яшчэ больш пагаршае становішча працоўных мас гораду і вёскі. Большасьць рабочае клясы ў Польшчы зьяўляецца хранічна беспрацоўнаю. У рабочых кварталах Варшавы, Лодзі, Вільні, Дамброўскага басэйну і г. д. лютуюць пошасьці, голад і самагубствы. Толькі ў вёсцы больш мільёну беспрацоўных.

На Зах. Беларусі, як і на Зах. Украіне, палітыка акупантаў, накіраваная супроць працоўных мас, супроць узрастаючага нацыянальна - вызваленчага руху, яшчэ больш закабальвае масы. Палітыка апалячваньня, выкіданьня «інародцаў» з дзяржаўных і камунальных устаноў і прад прыемстваў, падатковы цяжар на Зах. Беларусі, палітыка штрафаў, нацыянальнага і культурнага ўціску, зачыненьне ўсіх беларускіх школ з забаронаю на працягу 7-мі год алкрываць беларускія школы, прасьледваньні літоўскіх і яўрэйскіх школ, прасьледваньні беларускай мовы і ўсякіх праяў нацыянальна-вызваленчага руху, карныя экспедыцыі, масавыя зьбіваньні рабочых і сялян, тысячы і дзесяткі тысяч арыштаваных у горадзе і на вёсцы, шыбеніцы і сьмяротныя прысуды,—вось вам, таварышы, молюнак таго, што адбываецца цяпер ва ўсёй Польшчы, а асабліва на Зах. Беларусі.

Працоўныя масы Зах. Беларусі, як і ўсёй Польшчы, усё больш прыходзяць да перакананьня, што нельга жыць па старому. Маса радыкалізуецца. Расьце рэвалюцыйны рух у горадзе, набываючы ўсё больш бурны характар. Звужваецца база ўплыву сацыял-фашыстаў на масы. Праўда, сацыял-фашызму, ужываючы радыкальную дэмагогію і «левыя» манэўры ўдаецца часамі ўтрымліваць свае ўплывы на некаторыя часткі адсталых рабочых і таму сацыял-фашызм застаецца і надалей найбольш небясьпечным нашым ворагам у справе заваяваньня большасьці рабочае клясы для пралетарскай рэвалюцыі. Але масы ўсё больш пераконваюцца, што адзінае выйсьце з крызысу, гэта тое, што паказвае Кампартыя, рэвалюцыйнае выйсьце, пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы і на Зах. Беларусі.

Цэлы рад гераічных забастовак—варшаўскіх трамвайшчыкаў, лодзінскіх тэкстыльшчыкаў і трамвайшчыкаў, віленскіх гутнікаў і т. п., што адбыліся пад непасрэдным кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, бурныя дэманстрацыі беспрацоўных, растучая барацьба рабочых і сялян за вуліцу і бяі з паліцыяй, стыхійная і арганізаваная барацьба сялян у ЗБ і ва ўсёй Польшчы, шырокая барацьба супроць падаткаў і шарваркаў, падпалы маёнткаў памешчыкаў, канфіскатаў і кулакоў, асаднікаў, забойствы паліцыянтаў, масавае высяканьне лясоў—вось моманты, якія пацьвярджаюць, што мы перажываем цяпер у Польшчы круты рэвалюцыйны ўздым, што ўсё больш насыпаюць прадпасылкі да рэвалюсытуацыі.

Цяпер, як ніколі раней, ставіцца перад масамі пытаньне рэвалюцыйнага выхаду з крызысу, пытаньне: «хто кага, альбо далейшая эксплёатацыя, акупацыя, тэрар буржуазіі, далейшае панаваньне капіталізму, альбо перамога сацыялізму». У гэтай барацьбе, якая з кожным разам усё больш завастраецца, набывае ўсё больш бурныя формы, вялізарную ролю адыгрываюць вашыя посьпехі і перамогі на ўсіх франтох.

Моц і магутнасьць Савецкага Саюзу, гаспадарчы і культурны рост і ўзмацненьне СССР—гэта шляхаводная зорка для працоўных мас Зах. Беларусі, якія змагаюцца супроць фашызму. Гэта дасканала разумее наш вораг. Ён увесь час вядзе траўлю супроць Савецкага Саюзу, асабліва-ж супроць БССР. У гэтай кампаніі хлусьні і цкаваньня супроць СССР і БССР, супроць рэвалюцыйнага руху і нацыянальна-вызленчага руху працоўных мас Зах. Беларусі прымаюць найактыўнейшы ўдзел беларускія нацдэмы—беларускія нацыянал-фашысты ў нас. Луцкевічы, Астроўскія, якія зьяўляюцца непасрэднымі агентамі польскіх акупантаў, жывуць і працуюць на грошы польскай ахранкі; яны зацятыя ворагі працоўных мас Зах. Беларусі. Але ўсе іх намаганьні і спробы адарваць працоўныя масы ад рэвалюцыйнага руху і ўпрэгчы іх у воз акупантаў,—натыкаюцца на рашучае супраціўленьне з боку працоўных мас, якія гоняць прэч гэтых панокіх агентаў і прахвостаў. Усё больш пашыраецца і мацнее ўплыў Камуністычнай партыі, усьведамленьне ў шырокіх масах, што КПЗБ—адзіная рэвалюцыйная сіла, якая сапраўды змагаецца супроць галоўнага ворага—польскага акупанта, супроць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, за самавызначэньне ўсіх прыгнечаных народаў, аж да аддзяленьня, адзіная партыя, якая паказвае правільнае рэвалюцыйне выйсьце з крызысу.

У апошнія часы ўзмацнілася шалёнае падрыхтаваньне з боку польскага фашызму да ваеннага нападу на Савецкі Саюз. У сувязі з вінай у Манчжурыі, усе імпэрыялістычныя мракабесы ізноў ажывілі сваю дзейнасьць. Паездка Пілсудзкага ў Румынію, назначэньне Пілсудзкага маршалам польска-румынскай арміі, «спацэры» французкіх генштабістаў па Польшчы і Румыніі, ажыўленьне дзейнасьці групы атамана Булак-Балаховіча, перагаворы паміж украінскай і беларускай контрэвалюцыйнай пад кіраўніцтвам польскага фашызму, павялічэньне арміі і паліцэйскіх сіл, насаджваньне па вёсках Зах. Беларусі цёмных элементаў, узбраеньне польскіх калёністаў-асаднікаў, зацятая кампанія польскай прэсы супроць Савецкага Саюзу, —усё гэта паказвае, што польскі фашызм шукае выйсьце з крызысу шляхам інтэрвэнцыйнай вайны проці Савецкага Саюзу.

Задача нашай партыі мабілізаваць працоўныя масы ў абарону Савецкага Саюзу, бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету, мабілізаваць масы на барацьбу проці падрыхтоўкі вайны.

Таварышы! Ад імя рабочых і працоўных мас Зах. Беларусі мы можам вас запэўніць, што ў выпадку ваеннага нападу на Савецкі Саюз і БССР працоўныя Зах. Беларусі, як і ва ўсёй Польшчы ня будуць заставацца са сваімі братамі, наадварот, разам з вамі накіруюць сваю зброю суспроць эксплёататараў, супроць польскіх паноў і будуць змагацца за пралетарскую рэвалюцыю ў Польшчы і на Зах. Беларусі.

(Бурная авацыя).

Задачай КПЗБ заваяваць большасьць рабочае клясы пры правільным дастасаваньні тактыкі адзінага фронту зьнізу, асабліва рашаючыя заводы пралетарыяту; узмацніць самастойнае кіраўніцтва барацьбою рабочых, стаць на чале і арганізацыйна ахапіць стыхійны рух сялянскіх мас і іхную барацьбу супроць падаткаў, шарваркаў, зямельнай фашыстоўскай палітыкі, супроць акупанта; узмацніць барацьбу супроць нацыянал-фашызму і сацыял - фашызму, барацьбу на два фронты—супроць правага апартунізму і «левых» загібаў, няўхільную барацьбу з перажытканьнямі люксэмбургіянства ў партыі і меншавіцкіх рэштак ППС лявіцы; рашуча выпраўіць цэлы рад памылак, зробленых радам арганізацый у справе кіраўніцтва барацьбою рабочае клясы, у справе кіраўніцтва нацыянальна-вызваленчай барацьбой і інш.; узмацніць і пашырыць трансмісіі партыі да мас, узмацніць саюз рабочае клясы і сялянства, узмацніць арганізацыйны рост партыі і камсамолу, пашырыць ініцыятыву і самастойнасьць кожнай партыйнай арганізацыі і яе пасобных зьвеньняў; завастрыць змаганьне за зрыў імпэрыялістычных плянаў фашыстоўскай Польшчы, падрыхтаваць масы да таго, каб ператварыць імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую, — вось тыя падставовыя задачы, якія пастаўлены перад партыяй III пленумам ЦК КПП і V пленумам ЦК КПЗБ.

Перад нашай партыяй стаяць вялізарныя гістарычныя задачы: падрыхтаваць масы да пралетарскай рэвалюцыі, мабілізаваць працоўныя масы ўсёй Польшчы пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ на барацьбу за заваяваньне большасьці рабочае клясы і праз частковыя баі—да барацьбы за ўладу, за пралетарскую рэвалюцыю. Гэтую барацьбу супроць фашыстоўскай дыктатуры, супроць фашызму і сацыял - фашызму мы будзем весьці пад кіраўніцтвам Камінтэрну ў саюзе з рабочай клясай Германіі, якая змагаецца побач з намі на чале з сваёй гераічнай Кампартыяй.

(бурныя воплескі).

КПЗБ і КП(б)Б вядуць пад сьцягам ленінізму барацьбу на розных вучастках аднаго рэвалюцыйнага фронту, фронту міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. Узмацненьне барацьбы на гэтых вучастках прывядзе да хутчэйшай перамогі камунізму, да ажыцьцяўленьня сацыялізму ня толькі ў СССР, але і ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве КП(б)Б. Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная партыя бальшавікоў і яе правадыр т. Сталін. Няхай жыве Камуністычны Інтэрнацыянал. Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы.

(Бурныя воплескі, якія пераходзяць у авацыю).

Па БССР

АДБЫЎСЯ ЗЬЛЁТ ЮНКОРАЎ ГОР. МЕНСКУ. Зьлёт заслухаў даклад аб задачах юнкораў у рэалізацыі прамовы тав. Постышава на III пленуме ЦК УсеЛКСМ. Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі, у якіх делегаты лакцыі «Комсомольская Правда».

Юнкоры зьлёту слухаюць даклад.

ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА «СПАРТАК» з 26 па 31 студзеня выпрацавала 130,9 тоны паперы, што складае 68,39% пляну. З 1 па 31 студзеня выпрацавана 673,4 тон, што складае 66,59 проц. пляну. Частку прастояў за гэты час трэба аднесьці за кошт перабояў у дастаўцы энэргіі з БелДРЭС'у.

ДОБРУСКАЯ ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА «ГЕРОЙ ПРАЦЫ» зноў пачала здаваць тэмпы. На 1 лютага замест 100 тон паперы фактычна выпрацавана 15,8 тоны.

ПАПЯРОВАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА 24 студзеня дзённае заданьне выканала на 96,5 проц., за 25 студзеня—96,5 проц., за 26—90,5 проц., 27—82,9 проц., 28—102,5 проц., 29—90,5 проц., 30 студзеня—90,5 проц.

БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ КАМІТЭТ САЮЗУ РАБОЧЫХ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ, разам з ЦК саюзу СССР і з Заходнім абласным камітэтам, 7 лютага склікае ў Менску міжрэспубліканскую нараду вядучых працаўдзеў сьвінасаўгасаў. На нараду выклікаецца 350 чалавек. На нараду дня нарады: вынікі абсьледваньня саўгасаў Сьвінаводтрэсту, камісіі ЦКК і НК РСІ СССР, папярэднія вынікі зімаваньне жывёлы, захоўваньня маладняка і далейшыя перспэктывы, ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і становішча арганізацыі працы гаспадарча-разьліковых брыгад у жывёлагадоўчых саўгасах.

ЗА ПАРУШЭНЬНЕ ПАРАДКУ ВЯДЗЕНЬНЯ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК у галінных пунктах (дапушчэньне загатовак на ўсіх сельпажыўтаварыствах), за безадказнае становішча з вутотам загатовак і выдачы збожжа, прыцягнута да крымінальнай адказнасьці праўленьне Магілеўскага і Полацкага райспажыўсаюзу. За бесспадстаўнае выдапкаваньне збожжа ў колькасьці 2977 цэнт. Чашніцкім райсаюзам і 1737 Аршанскім райсаюзам, праўленьні гэтых саюзаў прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.

НА ПАНЧОШНАЙ ФАБРЫЦЫ імя КЛАРЫ ЦЭТКІН (Віцебск) арганізавана 13 тэхнічных гурткоў і 5 гаспадарча-разьліковых брыгад імя XVII партканфэрэнцыі. Арганізаваны курсы брыгадзіраў гаспадарча-разьліковых брыгад. Панчошнікі пасылаюць брыгады ў падшэфныя брыгады на прапрацоўку тэзісаў XVII партканфэрэнцыі.

Тав. Чарвякоў—дэпутат Біра-Біджанскага гарсавету

МЕНСК. (Белта). Рабочыя фабрыкі па выробе дэталяў для с.-г. машын, у Біра-Біджане, аднагалосна абралі ў Гарсавет у якасьці свайго дэпутата тав. Чарвякова.

НА ПРАЦЯГУ СТУДЗЕНЯ-ЛЮТАГА МЕСЯЦАЎ, сіламі саміх гаспадарча-разьліковых брыгад і фабрычна-заводзкага друку, праводзіцца праверка работы гаспадарча-разьліковых брыгад. ЦСПСБ у рэзалюцыі прынятай па гэтым пытаньні піша: «Усе недахопы, якія будуць выяўлены за час праверкі, павінны быць на-ходу выпраўлены і ўся работа па праверцы павінна быць накіравана на забясьпечаньне неабходных умоў для пасьпяховай работы брыгад, на выкананьне і перавыкананьне плянаў чацьвертага году пяцігодкі. Асаблівы ўціск робіцца на якасныя паказьнікі.

АРШАНСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ ПЕРАВЫДАТКАВАЎ за два апошнія кварталы 1931 году 159 тон печанага хлеба, ня гледзячы на жорсткія дырэктывы, пра ашчаджэньне выдаткаваньня хлебапрадуктаў. У сувязі з гэтым, Белкаапсаюз пастанавіў прыцягнуць праўленьне Аршанскага райспажыўсаюзу да суровай адказнасьці.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ДОМ АСЬВЕТЫ.

7 лютага а 7-й гадз. увеч. адбудзецца адкрыты партыйна - камсамольскі сход калектыву Працасьветы.

Парадак дня: 1) Вынікі XIV зьезду КП(б)Б і тэзісы XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б), дакл. т. Гурэвіч.

Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску.

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 13-II-32 г. у г. Лепелі будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разглядзе наступных апэляцыйных спраў:

1) Плаўніка Рыгора Захар. (Лепельскі р.). 2) Сацукевіча Сяргея Васіл. (Лепельскі р.) 3) Канонава Гаўрылы Тодар. (Лепельскі р.). 4) Кунцэвіча Т. А. (Лепельскі р.). 5) Марозава Сьцяпана Міхас. (Чашніцкі р.). 6) Школьніка Ёсіпа (Чашніцкі р.). 7) Шыкуна Міхаэся Сьцяпан. (Чашніцкі р.). 8) Данюшы Трафіма Ёсіпава (Чашніцкі р.).

Прысутнасьць памянёных т. т. ці ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова.

Праезд за свой кошт.

Член ПК ЦКК КП(б)Б Блоштэйн.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Пастанова Народнага Камісарыяту Працы БССР

25 га студзеня 1932 г. № 5 гор. Менск

„Пра сыстэмы заработнай платы для работнікаў народных камісарыятаў, цэнтральных устаноў, гаспадарчых аб'яднаньняў, трэстаў, банкаўскіх і каапэрацыйных арганізацый".

I. Парадак устанаўленьня пасадных акладаў

У мэтах стварэньня стымулу для ўзьнімацьня прадукцыйнасьці працы, палепшаньня якасьці работы, узмацненьня працоўнае дысцыпліны, а таксама зьнішчэньня ўраўнялаўкі ў аплаце і ўстанаўленьня сыстэмы аплаты работнікаў апарату у залежнасьці ад кваліфікацыі, аб'ёму работы і якасьці яе, Народны Камісарыят Працы БССР на падставе пастановы СНКБ ад 20-I—1932 г. **пастанаўляе:**

1. Увесьці з 1-га студзеня 1932 г. далучаемыя пры гэтым схэмы пасадных акладаў для работнікаў народных камісарыятаў, цэнтральных устаноў, гаспадарчых аб'яднаньняў, трэстаў, каапэрацыйных і банкаўска-юрыдычнай сыстэмы *).

2. У мяжох паказаных у схэмах пасадных акладаў, адміністрацыя устаноў і арганізацый устанаўлівае разьмеры аплаты пэрсанальна кожнаму працаўніку, улічваючы пры гэтым кваліфікацыю, аб'ём работы і якасьць яе кожнага працаўніка паасобку.

Ні ў якім разе недапускаецца агульнае адняесьньне ўсіх работнікаў да вышэйшых ставак схэм акладаў і ўстанаўленьне аднолькавага разьмера аплаты працаўнікам розных кваліфікацый, нават калі яны выконваюць аднародную работу.

3. Увядзеньне новых пасадных акладаў павінна быць праведзена ў межах зацьверджаных фондаў заработнай платы.

Правышэньне максымальных і зьніжэньне мінімальных акладаў устаноўленых Наркампрацы, катэгарычна забараняецца.

II. Парадак увядзеньня зьдзельнай сыстэмы аплаты

4. З 1-га лютага 1932 году адміністрацыя устаноў і арганізацый абавязана прыступіць да пераводу на стымулюючыя сыстэмы аплаты (зьдзельная і пачасова-прэміяльная) усіх работнікаў апарату, пабудаваўшы новыя формы аплаты ў прамую залежнасьць ад вынікаў работы кожнага працаўніка паасобку.

У аснову пабудовы заахвочваючых і стымулюючых сыстэм аплаты працы павінны быць пакладзены выключна стаўкі паказаныя ў схэмах Наркампрацы.

5. Па тых прафэсіях служачых, праца якіх ня можа быць дакладна вучцена і нармавана, павінна быць увядзена простая зьдзельная аплата працы.

У першую чаргу кіраўнікамі устаноў павінны быць пераведзены на зьдзельшчыну—машыністкі, рататарыцькі, цыклографісты, рахункавыя працаўнікі, штатыстычны пэрсанал, работнікі механізаванага зучоту і абслугоўваючы пэрсанал.

6. Нормы выпрацоўкі для пералічаных у п. 5 прафэсій і акрамя машыністак), устанаўліваюцца адміністрацыяй устаноў, пры чым нормы павінны быць максымальна тэхнічна магчымыя (з разьліку на ўдарніка), на грунце хроматражных наглядаў або фотографіі рабочага дня.

Устанаўліваемыя нормы выпрацоўкі могуць на працягу 2-х месяцаў папраўляцца, ці ўдакладняцца з тым, аднак, каб па сканчэньні гэтага тэрміну яны павінны быць замацаваны на адзін год, за выключэньнем выпадкаў яўнага памылковага ўстаноўленых норм, зьмен арганізацыі працы, ці механізацыі работ, у выніку якіх аўтаматычна павялічваецца выпрацоўка.

Нормы выпрацоўкі павінны быць установамі перагледжаны ў выпадках выданьня Народным Камісарыятам Працы норм выпрацоўкі для той ці іншай работы.

7. Расцэнкі зьдзельнай аплаты працы ўстанаўліваюцца шляхам дзяленьня пасаднай стаўкі на ўстаноўленую норму выпрацоўкі.

8. Работнікі, выконваючыя па сваёй віне ўстаноўленай нормы выпрацоўкі атрымоўваюць заработную плату адпаведна колькасьці фактычна выкананай работы, але ня ніжэй ⅔ пасаднага акладу.

9. Брак па віне работнікаў не аплачваецца. Аплата забракованай работы не па віне работніка, а таксама аплата зьвыштэрміновай работы і начной, вытвараецца ў адпаведнасьці з існуючым у данай установе колдагаворам.

10. Перарывы ў работе не па віне работніка аплачваюцца з разьліку 50 проц. пасаднага акладу пакладзенага ў аснову ўстанаўленьня зьдзельных расцэнкаў.

11. Пераход на зьдзельную сыстэму аплаты за ўсіх выпадках ажыцьцяўляецца ў межах зацьверджаных фондаў заработнай платы, ці за лік эканоміі, якая стварэецца ў выніку скарачэньня штата, улічваньня работы чарга лінію і павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Сродкі, якія застаюцца ў выніку недакамплекта штатаў ні ў якім разе ня могуць быць скарыстаны для праведзеньня зьдзельнай сыстэмы аплаты, і механічнага павышэньня заработнай платы.

III. Пачасова-прэміяльная аплата

12. Для тых катэгорый работнікаў, праца якіх ня можа быць дакладна вучцена і нармавана (кансультанты інспэктары, інструктары і г. д.), з 1-га лютага 1932 г. адміністрацыя ўстаноў і арганізацый павінна прыступіць да ўвядзеньня прэміяльна-пачасовай сыстэмы аплаты, якая дала-б больш павышаную аплату найбольш працаздольным работнікам у адпаведнасьці з кваліфікацыяй, аб'ёмам, складанасьцю і цяжкасьцю работ кожнага з іх.

13. Пачасова-прэміяльная сыстэма аплаты павінна быць пабудавана на поўна ўстаноўленых адміністрацыяй кожнай установы прынцыпах і канкрэтных паказчыкаў работы для кожнай катэгорыі работнікаў.

Як прыкладныя паказчыкі—Наркампрацы лічыць наступныя:

а) датэрмінова якаснае выкананьне плянавых і апэрацыйных заданьняў (складаньне плянаў, кантрольных лічбаў, калькуляцый і распрацоўка пасобных работ);

б) датэрмінова якаснае складаньне балянсаў, разьлікавых ведамасьцей на заработную плату рабочых і поўнае зьвышэньне пралікаў і памылак з імі;

г) эканомія сродкаў ад сэканомленага пазарадкаваньня, сыгналізацыі і рэзаньня з боку пасобных работнікаў ці частак апарату на недахопы і прарывы;

в) датэрмінова якаснае выкананьне ўсялякага роду соцыяльна эканамічных заданьняў і масавых кампаній па розных пытаньнях, як-та: хлеба, ільна, леса торп, дрэва і інш. нарыхтовак, мабілізацыя ўнутраных сродкаў і рэсурсаў, павялічэньне таваразвароту і інш.

д) датэрміновае складаньне і адсылка ў вышэйшыя інстанцыі розных статыстычных форм, вестак і зьнішчэньне тым самым выдаткаў на тэлеграфныя, тэлефонныя і паштовыя запытаньні і напамінкі, ці патрабаваньні дадатковых тлумачэньняў па недобраякасных матэрыялах;

е) поўнае зьнішчэньне выдаткаў па звышгарміновых работах і г. д.

Пры ўсіх пералічаных, ці дадаткова ўстанаўліваемых адміністрацыяй паказчыкаў, прэміі ўстанаўліваюцца ня толькі за перавыкананьне, ці за датэрміновае правядзеньне работ, але кожная работа павінна разглядацца з пункту погляду якасьці і карысьці, якія атрымоўваюцца ў выніку праведзеньня яе ў жыцьцё.

14. Агульная сума прэміі пры выкананьні ўстаноўленых для той ці іншай работы якасных і колькасных паказчыкаў, ня можа перавышаць 75 проц. месячнай стаўкі заработнай платы, устаноўленай для данай пасады, пакалад, устаноўлены па данай пасадзе схэмай ставак Наркампрацы.

Напрыклад: па шкале прэміраваньня прадугледжаны пэўныя паказчыкі для той ці іншай работы.

Выканаўца (з пасадным акладам у 200 руб. у месяц) выканаў даручаную яму работу датэрмінова на 4 дні (пры бяспрэчнай якасьці), з'эканоміўшы пры гэтым пэўную суму грошай. Выканаўца павінен быць прэміраваны па 3-х паказчыках: а) за датэрміновае выкананьне (прапорцыянальна колькасьці з'эканомленых дзён); б) за якасьць работы і г) за эканомію дзяржаўных сродкаў.

Пры чым процант па шкале прэміраваньня павінен быць устаноўлены для кожнага паказчыка розны ў залежнасьці ад рашаючай ролі таго ці іншага паказчыка.

Прылічваючаяся прэміяльная ўзнагарода павінна выдавацца штомесячна.

15. Пры сыстэматычным невыкананьні работнікам па сваёй віне плянавых і ўне-плянавых заданьняў па ўстаноўленыя адміністрацыяй тэрміны, адміністрацыя ўстановы можа перавесьці паказанага работніка ў нізкэйшы аклад, устаноўлены па данай пасадзе схэмак ставак Наркампрацы.

16. Разам з устанаўленьнем норм расцэнак і сыстэм прэміраваньня, адміністрацыя ўстаноў абавязана ўстанавіць парадак пастановкі вучоту і контроль выканаўня, вылучыць пэрсанальныя асобы, на якіх укладзецца адказнасьць за вядзеньне вучоту па кожнай частцы апарату пераведзенага на зьдзельна-прэміяльную сыстэму аплаты—распрацаваць парадак разьмеркаваньня прэміі паміж асобнымі работнікамі і кіраўнікамі тых ці іншых частак апарату, а таксама забясьпечыць вядзеньне падліку эканоміі за кожны месяц у выніку пераходу на зьдзельную, ці пачасова-прэміяльную сыстэму аплаты.

17. Пры пераходзе на пачасова-прэміяльную сыстэму аплаты забараняецца:

а) выплата па саймішчэньню па 2-х пасадах у той жа ўстанове;

б) дадатковыя выплаты за выкананьне асобных работ, якія уваходзяць у кола абавязкаў працаўніка (складаньне сымет, дакладаў і інш.), а таксама за ўдзел у міжведасьцьвенных камісіях і паседжаньнях і

в) выплата працаўнікам з ненармаваным рабочым днём кампэнсацыі за ўсякага роду нагрузкі.

18. Прэміраваньне можа выпрацоўвацца толькі ў межах зацьверджанага для данай установы фонда заработнай платы.

Фонд прэміраваньня стварэецца з эканоміі атрыманай у выніку скарачэньня штатаў, як вынік павышэньня прадукцыйнасьці працы, узмацненьня працоўнай дысцыпліны, улічваньня рабочага дню, рацыяналізацыі і да т. п., а таксама шляхам выдзяленьня ў распараджэньне кіраўніка ўстановы 1 проц. ад гадавога фонду заработнай платы па апарату данай установы.

Правышэньне зацьверджанага фонда заработнай платы катэгарычна забараняецца.

19. Распрацаваныя адміністрацыяй устаноў палажэньні аб прынцыпах і парадку ўжываньня і правядзеньня пачасова-прэміяльнай сыстэмы аплаты—павінны ўзгадняцца з профарганізацыямі і рэгістравацца ў органах працы.

Рэспубліканскія ўстановы ўносяць свае палажэньні аб пачасова-прэміяльнай сыстэме аплаты ў рэгістрацыю ў Народны Камісарыят Працы.

IV. Заключныя палажэньні

20. Для пасад, якія не пералічаны ў схэмах пасадных акладаў Наркампрацы, установы ня могуць самастойна ўстанаўліваць аклады, а павінны ўнесьці свае праекты для гэтых пасад на зацьверджаньне Наркампрацы.

21. Для пасобных высока-кваліфікаваных спэцыялістых наркаматы, цэнтральныя ўстановы, гаспадарчыя аб'яднаньні, банкаўскія і каапэрацыйныя цэнтры—могуць заключаць пэрсанальныя дагаворы з аплатай і зьвышпаказаных у схэмах пасадных акладаў выключна з дазволу ў кожным выпадку Народнага Камісарыяту Працы.

22. Усім наркамам і раённым інспэкцыям працы ўстанавіць кантроль за правільным устанаўленьнем адміністрацыяй акладаў, згодна схэм і пераводам работнікаў апарату на зьдзельную і пачасова-прэміяльную сыстэмы аплаты.

Праз месяц пасьля ўвядзеньня ў жыцьцё гэтай пастановы інспэкцыі працы сумесна з профэсійнымі арганізацыямі правесьці масавую праверку правільнасьці ўстанаўленьня акладаў і ўвядзеньня новых сыстэм аплаты.

Матэрыялы праверкі накіраваць у Наркампрацы.

23. Пры зьяўленьні парушэньняў устаноўленых акладаў, а таксама пры абнаружэньні выпадкаў, калі ўстаноўленыя аклады не адпавядаюць кваліфікацыі работніка, аб'ёму работы і якасьці яе, інспэкцыя працы павінна адмяніць незаконна ўстаноўленыя аклады і асоб вінаватых у гэтым прыцягваць да крымінальнай адказнасьці.

24. З выданьнем гэтай пастановы касуюцца пастановы Наркампрацы ад 12-IX—31 г. № 41 і ад 18-IX—31 г. № 43.

Народны Камісар Працы БССР Басін.

Начальнік сэктару арганіз. і аздараўленьня умоў працы Розэф.

Узгоднена з ЦСПСБ: Адам.

*) Схэмы пасадных акладаў будуць зьмешчаны ў асобным аборніку.

Лясная эстафэта

Вывезьці загатоўлены лес. Ніводнага бервяна не пакінуць на лесасеках

Апартуністычная практыка перашкаджае выкананьню лесазагатоўчых плянаў

Шпарны рост будаўніцтва новых заводаў і фабрык, будаўніцтва сэўгасаў, калгасаў, чыгуначнага транспарту патрабуюць неадкладнага выкананьня пляну па загатоўках і вывазцы лесу. Вось чаму тэмпы разьвіцьця лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасьці павінны быць шчыльна ўвязаны з усім народна - гаспадарчым плянам і агульнымі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Партыя і ўрад надаюць асаблівае значэньне рабоце лесадрэваапрацоўчай прамысловасьці і ў прыватнасьці лесазагатоўкам. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рабочая кляса на гэтым вучастку работы дамаглася вялікіх посьпехаў. Аднак, выкананьне плянаў лесазагатовак і лесавывазкі ў 4 квартале 3 рашаючага году значна адставала ад выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

Заданьне 4 кварталу на 1 студзеня 1932 году па загатоўцы будаўнічага лесу па БССР выканана на 85 проц., па загатоўцы дроў на 77,9 проц. Што-ж датычыцца вывазкі, дык тут стварэецца яўная пагроза пляну. Плян 4 кварталу на 1 студзеня па вывазцы будаўнічага лесу выкананы на 14,6 проц. і на 28 проц. па вывазцы дроў. Першая дэкада першага кварталу заключнага году дала яшчэ горшыя вынікі. Такое ганебнае адставаньне ў выкананьні плянаў дровалесазагатовак і вывазкі гаворыць аб тым, што кіраўніцтва большасьці леспрамгасаў усё яшчэ не перабудавалі сваёй работы па-новаму.

Лес прывезены на прыстань.

ня ведае адкуль ён павінен атрымаць іх. У Беллесаснабзбыце цяжка знайсьці весткі аб колькасьці адпушчанага апалу таму або іншаму спажыўцу. Адсутнічае кантроль за выкананьнем дагавораў і нарадаў.

На хвалях самацёку

А. М. паведамляе нас аб тым, што па Ельскім леспрамгасе лесазагатоўчы плян зусім сарваны. Работа леспрамгасу праходзіць самацёкам. Адсутнічае культурнасавая работа сярод лесарубаў. Калгасы Шышкі, «Беларускі камунар» ня выконваюць заключаных з леспрамгасам дагавораў на рабочую сілу.

У Леспрамгасе адсутнічае кантроль за выкананьнем дагавораў. Сельсавет ня прымае ніякіх мер да кулацка-заможных гаспадарак, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў.

Справаздачнасьць бухгальтэрыі адстае на 7 месяцаў, ня выяўлена запазычанасьць рабочым, якая на 1 кастрычніка 1931 году складала каля 40.000 руб. Лесбел не зьвяртае ўвагі на ўпарадкаваньне рахункоўай часткі Ельскага Леспрамгасу.

Свае людзі

Аб вялікіх непарадках у **Гомельскім леспрамгасе**